ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

год выдання 31-ы | № 17 (1758) | Аўторак, 26 лютага 1963 года | Цана 4 кап.

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

КАНДЫДАТЫ НАРОДА • ПРАЦЯГ РАЗМОВЫ АБ СУЧАСНАЙ ЛІТАРАТУРЫ • ПАТРЭБЫ ШКОЛЬНЫХ БІБЛІЯТЭК • КНІГІ, ЯКІЯ ХУТКА ВЫЙДУЦЬ У СВЕТ • З РОЗНЫХ ШЫРОТ

Вось зараз прагучаць тосты: «За маладую! За маладога! За іх шчасце!», як і мае быць на кожным вяселлі. Дарэчы, аб шчасці... Нявеста Соня Забейда ў сваіх 20 гадоў была ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Працоўнага Сцяга. Нядаўна працоўныя горада Гродна вылучылі яе, муляра будаўнічага ўпраўлення № 51, кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР. А цяпер вось і яшчэ адна падзея, вельмі важная ў жыцці Соні. Гэта можна бачыць па яе шчаслівым усхваляваным твары.

Фота Ул. КРУКА.

НАКАЗ АДЗІНЫ: ЖЫЦЬ КЛОПАТАМІ НАРОДА

Рэдакцыя карысталася дзвюма крыніцамі, каб праінфармаваць чытачоў аб сустрэчы пісьменнікаў і дзеячоў мастацтва, кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР са сваімі выбаршчыкамі. Па-першае, мы ўстанавілі сувязь з тымі раёнамі, дзе адбываліся сустрэчы; па-другое, непасрэдна звярталіся да саміх кандыдатаў у дэпутаты з просьбай падзяліцца ўражаннямі ад паездак.

На сходзе ў калгасе імя Матросава Навагрудскага раёна, дзе адбылася сустрэча выбаршчыкаў з Аркадзем Аляксандравічам Куляшовым, першым узяў слова настаўнік Валеўскай школы Уладзімір Аляксандравіч Урбановіч. Ён сказаў:

— Некалі прадстаўніком у савецкім парламенце ад нашага Навагрудскага раёна быў Якуб Колас. Цяпер наш дэпутат у Вярхоўным Савеце СССР — Пятрусь Броўка. Мы ганарымся такой дружбай з беларускай паэзіяй. І нібы па традыцыі ў Вярхоўны Савет БССР мы вылучылі паэта Аркадзя Куляшова. Спадзяёмся, што ён таксама апраўдае наш давер, бо ўся творчасць Куляшова заўсёды была цесна звязана з жыццём народа.

Надзвычай хораша, цёпла гаварыла пра паэта, творчасць якога яна добра ведае, калгасніца Ефрасіння Флейта. А яшчэ яна пажадала:

— Прыязджайце да нас часцей, таварышы пісьменнікі, і вы самі пераканаецеся, які ў нас цудоўны край, якія тут выдатныя і маляўнічыя куткі прыроды і якія тут жывуць людзі! Людзі сапраўды прыгожай душы. Нам будзе чым пахваліцца, а вам будзе пра што напісаць.

У Лёзне пабываў Міхась Лынькоў. Яго, так сказаць, афіцыйная сустрэча з выбаршчыкамі Лёзненскай выбарчай акругі адбылася ў раённым Доме культуры. Тут, як і належыць, выступілі даверaныя асобы, расказалі біяграфію кандыдата ў дэпутаты, прагучалі цёплыя, удзячныя словы ў адрас паважанага пісьменніка. Але, бадай, найбольш непасрэднымі і яркімі былі сустрэчы з людзьмі ў калгасах, рабочых пасёлках, школах. Міхась Ціханавіч пабываў у Надзежыцкім выбарчым участку, у калгасе «40 год Кастрычніка», у вёсках Гладанцы, Вялішкавічы...

— Ведаеце, нават мы самі не чакалі, што людзі нашага раёна так глыбока знаёмы з творчасцю Лынькова, — сказалі нам таварышы з парткома калгасна-саўгаснага ўпраўлення. — Падняўся на трыбуну ўчотчык калгаса «40 год Кастрычніка» Давыд Дземянцей, і проста прыемна было слухаць, як дасканала ведае ён усю творчасць нашага кандыдата. Ведае і любіць.

17 лютага ў гарадскім пасёлку Езярышча (Віцебская вобласць) у Доме культуры выбаршчыкі цёпла сустрэлі Пятра Фёдаравіча Глебку. Сюды прыйшлі ўсе ад старога да малога.

Настаўнікі Езярышчанскай школы М. Гулевіч, А. Ладкоўская расказалі выбаршчыкам пра жыццё і творчы шлях П. Глебкі, прачыталі ўрыўкі з яго твораў.

Пётр Фёдаравіч Глебка пабываў таксама ў вёсках Мяжа і Бычышчы, выступаў у школах.

Наш карэспандэнт сустрэўся з Максімам Танкам у той дзень, як ён толькі-толькі вярнуўся з Брэстчыны. Яўген Іванавіч быў пад уражаннем ад сваёй паездкі, сустрэч з выбаршчыкамі Мотальскай акругі і з захапленнем расказваў аб цудоўных людзях, аб іх справах, аб наказах яму, як будучаму дэпутату.

— Мяне прасілі памагчы хутчэй пабудаваць у Драгічыне электрастанцыю і новую бальніцу, але сказалі, што гэта — «між іншым». Галоўнае ж патрабаванне да мяне як да паэта — больш пісаць, пісаць для народа. Андрэй Ксенда, брыгадзір паляводчай брыгады, унёс нават прапанову занесці ў пратакол такое заданне: больш пісаць пра добрыя справы нашых людзей. А Мікалай Бялоў, калгасны інжынер, вельмі прасіў стварыць песню пра сельскіх механізатараў, такую песню, каб «лёгка спявалася пад рокат матораў».

Максім Танк пабываў у калгасе «Моладава», выступіў на нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі, падзяліўся сваімі творчымі планамі і задумамі.

У гарадскім пасёлку Брагін, калгасах «Шлях да камунізма», імя Калініна, у саўгасе «Астрагляды» рабочыя, служачыя, калгаснікі 10, 11, 12 лютага сустракаліся са сваім кандыдатам у дэпутаты Піменам Емяльянавічам Панчанкам.

— Брагінцы запрашалі часцей прыязджаць да іх. Гэта, дарэчы, адносіцца і да ўсіх нашых пісьменнікаў. Асабліва запалі ў памяць такія словы: прыязджайце, калі ў нас зацвітуць сады, — расказвае Пімен Емяльянавіч.

У Касцюковіцкім раённым Доме культуры адбылася сустрэча выбаршчыкаў з кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Касцюковіцкай выбарчай акрузе віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук БССР, народным пісьменнікам Беларусі Кандратам Кандратавічам Атраховічам (Крапівой).

На трыбуне даверaная асоба, рэдактар раённай газеты «Сцяг камунізма» Е. А. Крыскавец. Ён расказаў пра жыццёвы шлях і слаўную творчасць любімага беларускага пісьменніка К. К. Крапівы і заклікаў выбаршчыкаў аднадушна галасаваць за яго.

Многа цёплых слоў у адрас К. К. Крапівы сказалі ў сваіх выступленнях настаўніца Касцюковіцкай сярэдняй школы Е. Е .Шпаннікава, аграном калгаса «Парыжская камуна» В. М. Емяльянцаў і іншыя.

Перад прысутнымі з прамовай выступіў кандыдат у дэпутаты Кандрат Кандратавіч. Ён горача падзякаваў за высокае давер'е, запэўніў выбаршчыкаў, што аддасць усе сілы і веды беззапаветнаму служэнню роднай партыі і савецкаму народу.

Цёплыя сустрэчы К. К. Крапівы адбыліся таксама з хлебаробамі і жывёлаводамі калгаса «Першае мая» і саўгаса «Печанеж» Касцюковіцкага вытворчага ўпраўлення.

Да сваіх землякоў, якія вылучылі яго кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР, прыязджаў у гэтыя дні і Рыгор Раманавіч Шырма. Ён пабываў на выбарчых участках у калгасах Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Рыгор Раманавіч усхваляваны сустрэчамі і гаворыць, што асабліва яго кранула тое, як чула і беражліва шануюць яго землякі беларускую народную песню, як зацікаўлена ставяцца да творчасці нашых пісьменнікаў і працаўнікоў мастацтва.

Са сваімі выбаршчыкамі ў гэтыя дні сустракаліся таксама Янка Брыль і іншыя пісьменнікі і дзеячы мастацтва, якія балаціруюцца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР.

НА ПАРАДКУ ДНЯ—ПЫТАННІ ПРАПАГАНДЫ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

У адным з выступленняў на сходзе партарганізацыі Саюза мастакоў рэспублікі, які адбыўся 22 лютага, прагучала спасылка на пісьменнікаў. Паглядзіце, гаварылася, як яны клапоцяцца пра распаўсюджванне сваіх твораў. Зайшоўшы ў кніжны магазін ці на кніжны базар, вы можаце ўбачыць за прылаўкам побач з прадаўцом паэта ці празаіка. А хто з мастакоў пераняў гэты добры вопыт?

Хто — так і не знайшлі, відаць, гэта сапраўды нялёгка. Затое асобныя ўдзельнікі сходу даволі пэўна выказаліся супраць таго, каб мастак ператвараўся ў прапагандыста сваёй творчасці. «Мастаку няма чаго стаяць за прылаўкам. Добрую прадукцыю і так раскупяць», — заявіў Я. Красоўскі. Прытрымліваючыся аналагічнага погляду ўжо ў сувязі з гаворкай аб выступленнях мастакоў у друку, Я. Ціхановіч сказаў не менш катэгарычна: «Калі мастак піша фарбамі, з яго гэта і дастаткова».

Такія выказванні лішні раз пераконваюць, што партарганізацыя добра зрабіла, прысвяціўшы спецыяльны сход пытанням прапаганды выяўленчага мастацтва. Саюз мастакоў не можа стаяць у баку ад гэтай справы. Наадварот, яму належыць тут вялікая роля ініцыятара і арганізатара.

Думка Я. Красоўскага і Я. Ціхановіча не знайшла на сходзе падтрымкі, з ёю палемізавалі многія прамоўцы. Правільны тон у гэтым сэнсе задаў дакладчык З. Азгур. Крытыкуючы нашы газеты, часопісы, радыё, тэлебачанне, культурна-асветныя ўстановы за тое, што яны ўдзяляюць прапагандзе выяўленчага мастацтва вельмі мала ўвагі ды і вядуць яе часам некваліфікавана, ён адначасова прад'явіў строгі рахунак самім мастакам. І для гэтага ёсць падставы, бо сапраўды вельмі ж нямногія з іх адгукаюцца на просьбу выступіць з артыкулам, прачытаць лекцыю, сустрэцца з гледачамі. Калі ўлічыць яшчэ, што сілы мастацтвазнаўцаў у рэспубліцы вельмі малалікія, то відавочнай стане пільная патрэба, каб майстры разца і кісці былі і майстрамі прапаганды выяўленчага мастацтва, не абмяжоўвалі сваю дзейнасць творчай практыкай.

Мастак павінен пісаць не толькі кісцю, але і пяром, — падкрэсліў П. Нікіфараў. У саюзе ж усталяваўся такі «падзел працы», што журналісцкая і лекцыйная работа цалкам ускладзена на плечы мастацтвазнаўчай секцыі. Толькі асобныя жывапісцы, скульптары і графікі маюць сувязь з газетамі і часопісамі, прымаюць удзел у лекцыйных мерапрыемствах.

Размова на сходзе мела шырокі характар. А. Волкаў, А. Гугель, І. Карчэўскі, М. Тарасікаў і іншыя гаварылі аб многіх нявыкарыстаных формах азнаямлення гледачоў са здабыткамі выяўленчага мастацтва. Крытыкавалася работа рэдакцыі выяўленчага мастацтва Беларускага дзяржаўнага выдавецтва, мастацкага музея рэспублікі, сектара мастацтвазнаўства Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР. Удзельнікі сходу выказалі шмат прапаноў, ажыццяўленне якіх дапаможа палепшыць справу, павысіць зацікаўленасць саміх мастакоў у прапагандзе сваёй творчасці, у эстэтычным выхаванні працоўных.

ПЕРШАЯ КНІГА ПАЭТА

У паэзію прыходзіць усё больш і больш моладзі. Адзін за адным выходзяць у свет, займаюць сваё месца на паліцах кнігарань першыя зборнікі маладых. Некаторыя з іх з'яўляюцца радаснай падзеяй у літаратуры, прыхільна сустракаюцца чытачом, іншыя, наадварот, засмучаюць яго, бо не адпавядаюць сённяшнім патрабаванням да паэзіі. Бывае і так, у зборніку ёсць добрыя, сапраўды таленавітыя вершы, а побач з імі «мірна суіснуюць» вершы слабыя, невыразныя, вучнёўскія. Чаму так бывае? Чаму яшчэ выпускаюцца зборнікі дрэнных вершаў? Ці нельга паставіць выданне паэзіі так, каб адкрываючы зялёную вуліцу сапраўднай паэзіі, больш патрабавальна і больш уважліва адбіраць і рэдагаваць яе, каб звесці да мінімуму розны выдавецкі брак, не выдаваць тое, што не мае нічога агульнага з паэзіяй?

Усе гэтыя пытанні і былі прадметам размовы, якая адбылася на апошнім пасяджэнні савета рэдакцыі мастацкай літаратуры Белдзяржвыдавецтва.

Даклад аб маладой паэзіі, выдадзенай за мінулы год, зрабіў на пасяджэнні крытык Рыгор Бярозкін. Станоўча ацаніўшы большасць зборнікаў, ён у той жа час паказаў на канкрэтных прыкладах, што першыя кнігі маладых маглі б быць больш роўнымі і больш яснымі. Такія ж кнігі, як, напрыклад, зборнікі вершаў «Вясновая завязь» М. Ганчарова і «Пагранічныя сцежкі» М. Плотнікава, не варта было зусім выдаваць, — яны вельмі слабыя.

Абмеркаванне даклада вылілася ў цікавую дзелавую размову аб першых зборніках маладых. У ёй прынялі ўдзел Сяргей Грахоўскі, Янка Брыль, Анатоль Вялюгін, Аляксей Зарыцкі, Рыгор Барадулін, Навум Кіслік, Валянцін Тарас, Аляксандр Міронаў, работнікі выдавецтва З. Матузаў, А. Бажко, Я. Казека. Былі ўнесены цікавыя прапановы. Напрыклад, была выказана думка аднавіць добрую традыцыю, калі творы маладых рэкамендаваліся да друку часопісамі, газетамі, літаб'яднаннямі, а таксама асобнымі старэйшымі паэтамі. Усе пагадзіліся на тым, што сапраўды трэба запрашаць літаратараў да рэдагавання кніг маладых паэтаў на грамадскіх асновах.

Кандыдаты НАРОДА

ГАДЫ ЖЫЦЦЯ— ГАДЫ ТВОРЧАСЦІ

Было гэта 29 студзеня 1961 года. Старэйшаму ў нашай рэспубліцы Аршанскаму драматычнаму гуртку чыгуначнікаў прысвоілі званне Народнага тэатра. Адусюль панаехалі госці. Гледачы запоўнілі ўсе месцы, праходы, аркестравую яму. Калектыў у гэты вечар паказваў свой асноўны спектакль — драму А. Маўзона «Канстанцін Заслонаў». Але выканаўца галоўнай ролі быў сярод гледачоў. Яго замяніў Барыс Віктаравіч Платонаў. Народны артыст іграў разам з акцёрамі Народнага тэатра. Для апошніх гэта была вялікая школа майстэрства і натхнення.

Прыклад Платонава падхапілі іншыя. Трэба спадзявацца, што сувязь прафесіянальных артыстаў з самадзейнымі будзе ўсё болей умацоўвацца, станавіцца штодзённай. Магчыма, яна перарасце ў сапраўдную дружбу, зробіцца добрай традыцыяй. І, вядома, гаворачы пра гэтую традыцыю, заўсёды будуць успамінаць Барыса Платонава, які першы сыграў разам з аматарамі ў спектаклі Народнага тэатра.

Гэта толькі адзін эпізод з яго творчай біяграфіі. А яна ў акцёра вельмі вялікая — пачалася яшчэ ў 1922 годзе. Колькі роляў сыграў за гэты час Платонаў, колькі жыцця пражыў ён разам са сваімі героямі! Можна было б тут называць і называць акцёрскія перамогі...

Аднак мне хочацца звярнуцца толькі да той, пра якую ўжо ўспаміналася,—да Канстанціна Заслонава. Дакладней нават да аднаго эпізода ў спектаклі.

Вось ён, гэты эпізод. У кабінет Заслонава немцы прыводзяць маладога рабочага Аксаніча, які падаваў у час бамбёжкі сігналы савецкім самалётам. Фашысты хочуць знайсці арганізатара ўсіх цыверсій. Але Заслонава цяжка западозрыць у гэтым. Тады адзін з немцаў звяртаецца да Аксаніча. Ён абяцае выпусціць яго на волю, калі скажа, хто даў заданне. Аксаніч жа зусім малады, нічога яшчэ не паспеў убачыць у жыцці, а той, хто паслаў яго на дыверсію, не прыйдзе сюды і не выручыць.

І гэта чуе Заслонаў, які даваў заданне Аксанічу, а цяпер мусіць маўчаць! Абавязкова маўчаць. Інакш — усё прападзе... Заслонаў — Платонаў у гэтай сцэне знаходзіцца на другім плане, ззаду іншых. Прасцей і лягчэй было б паказаць яго на першым плане, няхай, маўляў, глядач сочыць іменна за ім. Але акцёр трактуе героя перш за ўсё стрыманым; найвялікшыя яго пачуцці бушуюць у глыбіні душы, амаль не выбіваючыся на паверхню. І якую вялікую трэба мець сілу волі, каб стрымаць усе гэтыя выпрабаванні, каб, хоць на якую-небудзь хвілінку забыўшыся пра ўсё, не закрычаць, каб не выдаць сябе нават ніводным неасцярожным рухам.

Гледачы бачаць, з якой вялікай сілай герой сціскае кулакі. Як да болю прыкусвае ён вусны, як моцна напружаны яго нервы. Амаль фізічна адчуваеш, як вельмі часта б'ецца яго сэрца.

Здаецца, не здолее доўга вытрымаць Заслонаў, здаецца, вось-вось здадуць нервы, пакінуць сілы. Твар яго раптам неяк пабялеў, нават трохі асунуўся. Зноў чуецца метадычна размернае пытанне да Аксаніча: хто даў яму заданне, — яшчэ з большай сілай ранячы сэрца Заслонава.

І раптам:

— Я...

Як крык набалелай душы, як стогн аблітага крывёю сэрца вырвалася гэтае «я» ў Платонава. Прыглушана, стрымана, але ўсё ж вырвалася. Няўжо так і не вытрымалі нервы, здалі сілы? Усё прапала, такі бясслаўны канец? Фашысты ўжо гатовы святкаваць перамогу—кіраўнік дыверсій аб'явіўся сам.

Але рана.

Заслонаў паволі-паволі — і якімі доўгімі паказаліся гэтыя секунды — падымаецца са стула. Трэба ж сабрацца з думкамі, трэба поўнасцю перамагчы свае пачуцці. І ўжо ў нейкае імгненне авалодаўшы сабой, ён робіць лёгкі, здаецца, нават непрымушаны жэст: маўляў, я сам спытаю ў Аксаніча.

Б. Платонаў гаворыць вельмі глуха, нейкім надтрэснутым голасам, увесь час і знешне і ўнутрана стрымліваючы вялікае ўзрушэнне, гора. Акцёр у гэты час стаіць спіной да глядзельнай залы. Але і па яго плячах, якія раз-пораз уздрыгваюць, і па моцна сціснутых кулаках, па тых намаганнях, якія ён прыкладвае, каб гаварыць спакойна, адчуваецца, як ўнутрана напружаны Заслонаў, якую вялікую перажывае ён драму. Як балюча праводзіць Аксаніча на смерць! І ці ўсё той зразумее, ці ўсё ацэніць?

Аксаніч не выдаў Заслонава. Ён пайшоў на смерць. Зніклі і фашысты. Партызанскі кіраўнік астаўся на нейкі час у пакоі адзін. Ну, здавалася б, пасля такога ўнутранага напружання, калі, чаго б там ні каштавала, трэба было стрымліваць сябе, цяпер можна даць волю тэмпераменту, няхай хоць на нейкае імгненне выб'юцца на паверхню ўсе пачуцці, якія былі заціснуты такой пругкай спружынай. Аднак акцёр не стаў гэтага рабіць. Слязу, усяго толькі адну слязу машынальна выцер з твару Платонаў. Але якое яна мае эмацыянальнае ўздзеянне, яна вартая трагічных рыданняў.

А колькі вось такіх шчаслівых хвілін падараваў Платонаў гледачам за сорак гадоў сваёй творчасці!

Кажуць, што талент з гадамі траціць сваю моц, што замест творчага непакою і гарэння астаецца толькі ясная, разважлівая мудрасць. Але той, хто бачыў апошнія работы акцёра — вобразы Лявона і Федзі Пратасава — той добра ведае, што да Платонава гэта ні ў якай меры не адносіцца.

У акцёра найвялікшая самаадача. Ён аддае мастацтву ўвесь свой талент, усе свае сілы, наогул усяго сябе.

Вось чаму мастацтва яго такое багатае і шчодрае. Яно ў самым высокім значэнні слова чалавечнае. Калі б не было гэтага мастацтва, мы былі б духоўна бяднейшыя. Яно нам патрэбна, вельмі-вельмі патрэбна. Яно дае нам новыя сілы. Памагае жыць. А што можа быць для мастака вышэйшае за гэта!

Народ любіць і паважае тых, хто любіць і паважае яго. Вось яшчэ адно пацвярджэнне гэтага — Барыса Платонава зноў вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР.

Анатоль САБАЛЕЎСКІ.

На вечарах выбаршчыкаў, у агітпунктах горада Баранавічы вялікай папулярнасцю карыстаецца светлавая газета, якая выпускаецца ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці гарадскога Дома культуры. Фотакарэспандэнт БЕЛТА А. Пераход сфатаграфаваў А. Жалязнову, С. Шыбайла, З. Тарасевіч, А. Горбік і Е. Абрашкевіч у час падрыхтоўкі чарговага нумара светлавой газеты.

Пісьменнік і ЧАС

ПРАБЛЕМА СТАРАЯ І — НОВАЯ!

Васіль БЫКАЎ

Гэта вельмі заманліва і важна — вызначыць нейкія спецыфічныя рысы літаратуры нашага часу— веку кібернетыкі, тэрмаядзерных рэакцый і прарыву ў космас. Думаецца аднак, што Міхась Стральцоў крыху перабольшвае, калі піша ў сваім артыкуле, што «наш час небывалы па размаху ўзаемапранікнення розных ведаў, навукі і з'яў мастацтва». Відавочная справядлівасць гэтага вызначэння ў адносінах да навук не дужа дастасуецца да такіх розных у сваёй спецыфічнасці сфер чалавечае дзейнасці, як навука і мастацтва. Наша літаратура і мастацтва пакуль што з прагнасцю накідваюцца на чорны хлеб праўды, па якім згаладнелі за шмат год культу Сталіна, а ў той жа час сапраўды здзіўляюць захапляюць заваёвы космасу, пазнанне мікра- і макрасвету... Пэўна, апроч відавочнага ўсім апераджальнага развіцця навукі і тэхнікі, у гэтым тоіцца нейкі парадокс часу, які прымушае задумацца аб многім. Вось чаму нельга не пагадзіцца з многімі слушнымі наконт гэтага думкамі Івана Навуменкі, бо сапраўды: ці ж у тым галоўны клопат літаратуры, каб адлюстраваць нейкі своеасаблівы рытм часу? Куды больш варта, здаецца, паклапаціцца аб праблемах старых, але затое важных, такіх, як наданне літаратуры яе законнага права на высокі інтэлектуалізм, філасафічнасць і нястомныя пошукі праўды жыцця, без чаго ні літаратура, ні адно з мастацтваў не могуць не толькі развівацца, але і колькі-небудзь працягла існаваць. У гэтай сувязі мне хацелася б выказаць некаторыя думкі, якія, можа, і не новыя, але на мой погляд, не страцілі надзённасці.

Самаю адметнай, самаю характэрнай і самаю важнай рысай літаратуры нашых дзён вельмі хацелася б бачыць праўду.

— Жыццё — гэта праўда, — пісаў чэшскі літаратар Карэл Палачак незадоўга да сваёй гібелі ў крэматорыі Асвенціма. І, відавочна, яна, праўда, як хлеб надзённы, патрэбна чалавеку.

Думаецца, не зусім справядліва некалі класік нашай літаратуры падзяліў праўду на некалькі розных праўд, якія дастасоўваліся да патрэб розных класаў. Можа быць, той падзел і правамерны быў для мінулага, але ён зусім беспадстаўны для нашага сёння, у якім праўда толькі адна — гэта праўда жыцця народа, бо нашы цяжкасці амаль заўжды — агульнанародныя, радасці таксама. Таму пісьменнік, маючы магчымасць схаваць сваю аўтарскую тэндэнцыю, не можа без шкоды для твора абысціся без праўды або абмежаваца паўпраўдай. Цяперашнія нашы чытачы (пра якіх мы пішам, што яны вельмі выраслі) — яны яшчэ і сведкі апісваемых падзей, яшчэ і самі героі твораў. Яны проста не возьмуць на павер фальшу, не будуць чытаць выдумку або спекуляцыю, і кніга застанецца ў магазіне або на складзе, паліцы і стэлажы якіх заўжды з вялікаю красамоўнасцю сведчаць аб вартасці літаратуры.

За час культу Сталіна ў грамадскім жыцці краіны накапіліся вялізныя нераспрацаваныя літаратурай залежы праўды, гадамі ў своеасаблівых звалах няўвагі прэлі сапраўдныя жыццёвыя канфлікты і ўсенародныя праблемы, тады як абавязак літаратуры бачылі ва ўслаўленні мудрасці сталінскае асобы і ўсяго, што па яго волі адбывалася ў краіне. Ілюстрацыйнасць як бы стала адметным стылем мастацтва таго часу, пры поўнай пагардзе да жыцця народа пісьменнікі ілюстравалі з усяе сілы, у поўную меру здольнасцей сталінскія лозунгі, у той час як не толькі парушаўся элементарна-чалавечы ўклад жыцця, але нават і характар вытворчых сіл шмат у чым перастаў адпавядаць патрабаванням далейшага прагрэсу. Літаратуру пазбаўлялі яе сапраўды гуманістычнага пачатку, у яе адбіралі права даследаваць жыццё і адкрываць ідэі, першай заўважаць сімптомы значных канфліктаў. Пустаслоўе, апісальнасць, наіўна-рамантычная ўзнёсласць там, дзе ў жыцці адбывалася драматычнае і трагічнае, баязлівая нераўчасць у адлюстраванні адмоўнага, вядома, не маглі запаліць сэрцы чытачоў. Адступленні ад жыццёвай праўды, ад прынцыпаў рэалістычнага мастацтва не дало магчымасці многім, часам нават тым, чый літаратурны талент быў агульнапрызнаны, стварыць паўнацэнныя творы. Наўрад ці можна сумнявацца ў тым, што аўтары тагачасных так званых лакіраваных кніг ведалі і разумелі сапраўднае становішча калгаснага сялянства, але калі яны стваралі свае «феерыі» на калгасныя тэмы, дык рабілі гэта, відаць, толькі задушыўшы ў сабе і шчырасць і грамадзянскую адказнасць.

РОЗДУМ МЕРКАВАННІ ПАЛЕМІКА

Але ў літаратуры мала аднае шчырасці, трэба яшчэ разумець жыццё, тэндэнцыі яго накіроўваючых сіл, трэба яшчэ мець сваё стаўленне да гэтага жыцця. Карацей кажучы, патрэбна яшчэ высокая інтэлектуальнасць, якая заключаецца не толькі ў суме ведаў, але і ў асаблівым, высокім стаўленні да свету духоўнага ў чалавеку, у разуменні і павазе чалавечага, у гуманістычнай аснове творчасці. Вядома, і ў часы культу аб гэтых патрабаваннях было нямала напісана, аднак практыка літаратурнай творчасці ў адрозненне ад дэмагагічнага пустаслоўя ведала свае неадольныя, часта дыяметральна процілеглыя тэорыі, шляхі. Вось чаму так сталася, што шмат якія з твораў тагачаснай літаратуры, што выдаваліся за ўзоры, не толькі не задавальняюць нас зараз, але і з'яўляюцца як бы жывым напамінкам аб тым, што чакае творчасць пісьменніка ў выпадку ягонай няўвагі да праўды жыцця. З гэтай прычыны мы, аддаючы належнае тэмам сучаснасці, павінны зрабіць усё, каб тыя змрочныя старонкі нашай гісторыі ва ўсёй іх суровай, часам трагічнай праўдзе былі засведчаны мастакамі. Пакуль яшчэ не позна, пакуль жывуць сведкі, праўду аб тым часе трэба сказаць, у гэтым я бачу наш абавязак.

Аднак гэта, відаць, будзе нялёгка. Трэба мець на ўвазе тую акалічнасць, што псіхалогія культу жывучая, што шматгадовае выхаванне ў яе духу пакінула свой след у свядомасці людзей. Яшчэ знаходзяцца чытачы (і ці ж толькі чытачы), якія, змалку ўвераваўшы ў разналікасць праўд, не хочуць ведаць, што праўда мае толькі адно значэнне, што яна не можа дзейнічаць супраць інтарэсаў перадавога грамадства, што няма другіх, якасна іншых гуманістычных стымулятараў для выхавання высокага ў чалавеку, апроч праўды. Ёсць яшчэ людзі, якія і сёння памылкова лічаць, што прыгожая мана можа быць болей карысная за горкую праўду, і таму, маўляў, навошта літаратуры поркацца ва ўсіх брыдкасцях, звязаных з часам культу Сталіна. Адсюль з'яўляюцца такая падазронасць да многіх спроб літаратараў разабрацца ў акалічнасцях часу, і пратэст супраць рэалістычнага адлюстравання жыцця, калі гэта адлюстраванне не прыгладжана, не аздоблена ружовымі фарбамі. Здараецца яшчэ, што ўчынкі і думкі герояў атаясамляюцца з пазіцыяй аўтара, і гэта дае падставу для гнеўнага разносу твораў. У гэтым сэнсе тым мастакам, якія не абыходзяць вострыя вуглы, даводзіцца не салодка, і чым болей таленавіты твор, чым з большаю сілай у ім адлюстравана жыццёвая праўда, тым большую супраціўляльнасць сустракае ён сярод гэтага кола чытачоў і крытыкаў. У нас часта забываюць, што **«вышэйшы крытэрый, асяродак сацыялістычнага рэалізму — мастацкая і жыццёвая праўда, якой бы суровай яна ні была»**, — як сказаў на сустрэчы з дзеячамі культуры сакратар ЦК КПСС Л. Ф. Ільічоў.

Сапраўды, гэта вельмі прыкра і крыўдна, калі шмат якія акалічнасці народнага жыцця, асабліва гадоў культу асобы, набыўшы ў літаратуры абагульненае значэнне, выклікаюць пярэчанні крытыкаў. Выкрыццё аджыўшага, старога не можа служыць нечаму іншаму, апроч як сцвярджэнню перадавога ў грамадстве. І тым не менш знаходзяцца беспрынцыпныя аглабельшчыкі з ліку лёгкіх на пад'ём крытыкаў, якія пэцкаюць чорнымі фарбамі творы, у

(Заканчэнне на 2-й стар.).

БІБЛІЯТЭКА Ў ШКОЛЕ

З. ДЗЯКАНАВА,
метадыст Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Ул. І. Леніна

Нядаўна я наведала 42-ю сярэднюю школу горада Мінска. Вялікі перапынак. Шумная, вясёлая дзетвара запоўніла прасторныя калідоры. З гэтага вірлівага дзіцячага патоку выдзяляюцца засяроджаныя хлопчыкі і дзяўчынкі, якія з кніжкамі ў руках імчацца на першы паверх да пакоя з шыльдачкай: «Бібліятэка». Гэта любімы куток юных кнігалюбаў школы. І не дзіўна — бібліятэка мае добра падабраны семнаццацітысячны кніжны фонд, які можа задаволіць патрэбы і малышоў-першакласнікаў, і вучняў дзесятых—адзінаццатых класаў.

Загадвае бібліятэкай Паліна Осіпаўна Доўнар. Семнаццаты год працуе яна ў гэтай школьнай бібліятэцы і дужа любіць сваю справу. У час перапынкаў яна штодзённа выслухоўвае сотні просьбаў: «Паліна Осіпаўна, у нас сачыненне «Радзіма ў творчасці рускіх паэтаў». Што можна па гэтай тэме прачытаць?»; «Ёсць кнігі пра Спартака?»; «У нас вечар, прысвечаны творчасці Маршака, памажыце падабраць яго вершы, песні»; «У мяне даклад «Заваёва космасу», парайце цікавы матэрыял»; «Што пачытаць услых акцябратам?». І так кожны дзень. Малышы, юнакі, важатыя, настаўнікі ідуць сюды за кнігай, за парадай.

У Паліны Осіпаўны многа і другіх спраў. Трэба правесці ў класах бібліятэчныя ўрокі аб тым, як выбіраць, чытаць, берагчы кнігу, трэба рыхтаваць вечары, канферэнцыі чытачоў, дыспуты.

Школьная бібліятэка — цэнтр арганізацыі пазакласнага чытання. Уся яе работа павінна быць звязана з вучэбна-выхаваўчым працэсам школы. Школьныя бібліятэкі праводзяць вялікую работу з кнігай па камуністычнаму выхаванню падрастаючага пакалення. Можна нагадаць тут індывідуальную работу з чытачом-школьнікам, прапаганду рашэнняў XXII з'езда КПСС, норм маральнага кодэксу будаўніка камунізма, піянерскіх законаў, а таксама займальныя вечары па фізіцы, матэматыцы, хіміі, розныя літаратурныя гульні і г. д.

Зразумела, што ўсё гэта будзе там, дзе на чале бібліятэкі стаіць чалавек, які любіць і ведае сваю справу, там, дзе дырэктар школы памятае аб месцы бібліятэкі ў сістэме вучэбна-выхаваўчай работы.

Можна назваць нямала школьных бібліятэк, у якіх добра ўкамплектаваны кніжныя фонды, дзе аддаецца вялікая ўвага кіраўніцтву чытаннем вучняў, дзе праводзяцца цікавыя мерапрыемствы па прапагандзе кнігі. Гэта бібліятэкі школ №№ 71, 26, 22, 41 г. Мінска, Клецкай сярэдняй школы, Чэрвеньскай сярэдняй школы № 2, трэцяй сярэдняй школы г. Віцебска, 16-й школы г. Магілёва, 16-й школы г. Гомеля і інш.

Аднак бліжэйшае знаёмства з работай школьных бібліятэк паказвае, што далёка не ўсюды яна стаіць на належным узроўні, што ёсць яшчэ шмат пытанняў, якія патрабуюць увагі грамадскасці.

Кніжныя фонды многіх школьных бібліятэк не задавальняюць запатрабаванняў вучняў школ. Камплектаванне іх як след не наладжана. У бюджэце школ самастойнага артыкула на камплектаванне бібліятэкі няма. Для гэтага выдзяляюцца сродкі, што адпускаюцца на вучэбныя дапаможнікі. Аднак атрымаць іх можна толькі адзін — два разы ў год.

Асабліва церпяць ад гэтага бібліятэкі сельскіх школ. Яны вымушаны набываць выпадковую літаратуру — тую, якая ёсць у мясцовых магазінах у той час, калі ім даюць грошы. Зразумела, што ні аб якім планавым камплектаванні цераз бібкалектар не можа быць і гутаркі. Так, з 236 бібліятэк сярэдніх школ Мінскай вобласці ў бібкалектары камплектавалася толькі 15 — 20. У выніку многія школьныя бібліятэкі не маюць дзіцячай мастацкай літаратуры, навукова-папулярнай, тэхнічнай, сельскагаспадарчай, кніг па дзіцячай тэхнічнай творчасці, адсутнічаюць работы па рэкамендацыйнай бібліяграфіі, зусім мала кніг беларускай дзіцячай літаратуры.

Чаму ж у бібліятэкі школ не трапляюць многія патрэбныя кнігі? На невялікія сумы, якія прызначаюцца для камплектавання школьных бібліятэк, набываецца таксама педагагічная літаратура, выпісваюцца перыядычныя выданні для настаўнікаў. Думаецца, што гэта няправільна. Кожны настаўнік па меры магчымасці набывае сам метадычныя дапаможнікі, выпісвае перыядычныя выданні. Апрача таго, метадычная літаратура ёсць у раённай, сельскай, гарадской бібліятэках, у бібліятэках райпедкабінетаў. А кніг для дзяцей у бібліятэках сельскіх школ не хапае! Думаецца, што адзіны шлях для паляпшэння камплектавання школьных бібліятэк — цэнтралізацыя сродкаў.

Калі гаварыць аб школьных бібліятэках, то варта, бадай, рабіць агаворку, што такая бібліятэка ў поўным сэнсе гэтага слова існуе толькі ў сярэдняй школе. «Бібліятэкі» ж васьмігадовых і пачатковых школ складаюцца з невялікай колькасці кніг, памяшканняў яны не маюць, абавязкі бібліятэкара выконваюць на грамадскіх асновах настаўнікі або піянерважатыя. Камплектуюцца гэтыя «бібліятэкі» ад выпадку да выпадку.

Ці не лепш было лічыць гэтыя бібліятэкі не самастойнымі, а філіяламі бібліятэчным калектары, а школы імі не камплектуюцца. Аблана варта наладзіць забеспячэнне школьных бібліятэк прадметамі бібліятэчнай тэхнікі (інвентарнымі кнігамі, дзённікамі, фармулярамі чытачоў) цэнтралізавана, так, як школы забяспечваюцца падручнікамі, класнымі журналамі.

А як наладжана кіраўніцтва работай школьных бібліятэк? Ні ў Міністэрстве асветы, ні ў аблана, ні ў абласных інстытутах удасканалення настаўнікаў няма інспектараў па школьных бібліятэках. Інспектары ж школ займаюцца імі вельмі рэдка — між іншых спраў. Шмат дапамогі аказваюць школьным бібліятэкам бібліятэкі сістэмы Міністэрства культуры. Наладжваюцца праверкі работы бібліятэк школ з прапановамі аб яе паляпшэнні, практыкумы, семінары. На жаль, часта гэтыя намаганні застаюцца толькі намаганнямі і не прыносяць ніякай карысці, бо школьны бібліятэкар не адчувае адказнасці за сваю працу, інспектары ў бібліятэкі не заглядваюць, далёка не ўсе дырэктары школ цікавяцца работай сваіх бібліятэк. Работу школьнай бібліятэкі вельмі рэдка абмяркоўваюць на педсавеце. Таму і парады бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры прымаюцца ў школах як парады «чужога дзядзькі» і не выконваюцца.

Для наладжвання супрацоўніцтва ў гэтай справе трэба, відаць, каб бібліятэчная інспекцыя Міністэрства культуры БССР і Міністэрства асветы рэспублікі прымалі агульныя намаганні аб паляпшэнні работы школьных бібліятэк, аб адказнасці кожнага дырэктара школы і бібліятэкара за справу, аб якой ідзе гаворка.

Павышэннем кваліфікацыі работнікаў школьных бібліятэк займаюцца інстытуты ўдасканалення настаўнікаў. З дапамогай абласных дзіцячых бібліятэк яны арганізуюць курсы, семінары бібліятэкараў школ. Аднак робіцца гэта несістэматычна. Планаў перападрыхтоўкі бібліятэкараў няма. Апошняя праграма курсаў для школьных бібліятэкараў была выдадзена Міністэрствам асветы яшчэ ў 1956 годзе.

Раённыя дзіцячыя бібліятэкі сумесна з райпедкабінетам праводзяць таксама семінары бібліятэкараў школ. Але часта райана не надае ім належнай увагі. Напрыклад, Крупская дзіцячая бібліятэка ў верасні мінулага года падрыхтавала такі семінар, нават запрасіла метадыстаў з Мінска. Аднак семінара не адбылося, бо райана не забяспечыла яўку бібліятэкараў.

Заслугоўвае падтрымкі ўдзел бібліятэкараў школ у жнівеньскіх нарадах настаўнікаў, дзе для бібліятэкараў арганізуюцца асобныя секцыі. У 1962 годзе такія секцыі працавалі ў большасці раёнаў рэспублікі. Напрыклад, у Мінскай вобласці з 24 раёнаў у 20-ці. Інструкцыйныя даклады на секцыях чыталі супрацоўнікі абласных дзіцячых і раённых бібліятэк. Аднак работа па павышэнню кваліфікацыі работнікаў школьных бібліятэк павінна праводзіцца больш сістэматычна і планава.

Кніга — магутны сродак у справе выхавання чалавека камуністычнага грамадства. Яна садзейнічае ўсебаковаму развіццю савецкіх школьнікаў, фарміраванню асноў матэрыялістычнага светапогляду, павышае і паглыбляе веды вучняў. І таму пра школьную бібліятэку трэба дбаць больш канкрэтна. Яна патрабуе ўвагі і дапамогі нашай грамадскасці.

ВЕЧАРЫ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ У КІЕВЕ

У Доме літаратараў Саюза пісьменнікаў Украіны сабраліся бібліятэчныя работнікі Кіева на вечар беларускай літаратуры. Прысутныя праслухалі даклад аб сучаснай беларускай літаратуры, які зрабіў заслужаны дзеяч культуры БССР Аляксей Слесарэнка. Пасля даклада ён выступіў з вялікай праграмай мастацкага чытання.

Чытальнік выканаў творы Я. Купалы, Я. Коласа, А. Куляшова, П. Броўкі, І. Шамякіна, М. Танка, М. Лужаніна, П. Пестрака, А. Звонака, К. Крапівы і інш.

Слухачы-бібліятэкары зацікавіліся беларускімі творамі і запрасілі А. Слесарэнку для выступлення у свае бібліятэкі. Артыст выступіў у бібліятэках імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, імя Салтыкова-Шчадрына.

Акрамя вечараў беларускай літаратуры, А. Слесарэнка прыняў удзел у вечарах, якія праводзілі ўкраінскія пісьменнікі ў Дарніцкім Доме чыгуначнікаў, клубе камбіната штучнага валакна, у дзвюх сярэдніх школах. Украінскі паэт Алесь Жолдак чытаў свае пераклады з беларускай паэзіі. У вечарах прынялі ўдзел пісьменнікі Юрый Макрыёў і Косць Дрок.

А. ГОМАН.

Гэтымі днямі ў сувязі са святкаваннем 45-й гадавіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту СССР у Беларускім акадэмічным тэатры імя Я. Купалы адбылася сустрэча артыстаў з пасланцом Чырвонасцяжнага Балтыйскага Флоту Р. С. Быстрыкавым і былым камандзірам эскадрыллі, Героем Савецкага Саюза Н. В. Папоўай, якія расказалі аб асобных эпізодах барацьбы савецкіх людзей супраць гітлераўскіх захопнікаў ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Народны артыст БССР Л. Р. Рахленка падзяліўся ўспамінамі аб рабоце тэатра ў гады вайны.

Наш карэспандэнт Ул. Крук сфатаграфаваў Р. С. Быстрыкава (пяты справа) і Н. В. Папову (трэцяя злева) у час шчырай і сяброўскай гутаркі з артыстамі тэатра.

ЛЯ ПАЛІЦЫ *перакладаў*

ПАДАРОЖЖА Ў КРАІНУ ПАЭМІЮ

Перада мною ляжыць кніга з вельмі своеасаблівай назвай «Краіна Паэмія». І хаця дарэмна шукаць на геаграфічных картах гэтую незвычайную краіну, яна ўсё ж існуе. У яе свае мацерыкі і акіяны, моры і стэпы, горы і даліны. Свая флора і фаўна. І людзі жывуць у гэтай краіне. Праўда, жыхары яе зусім маленькія — ад двух да пяці, магчыма, і крыху старэйшыя. А вось на геаграфічных картах яе няма. Таму што знаходзіцца яна ў іншым свеце — у свеце мастацкага вымыслу і цудоўнай фантазіі.

Адкрыта была гэта паэтычная краіна ў Францыі. Яе першаадкрывальнікам быў паэт Арман Го, які ў 1928 годзе склаў і выдаў анталогію паэзіі для дзяцей і назваў яе — «Краінай Паэміяй».

З таго часу гэтая кніга шмат разоў перавыдавалася, бо карысталася і карыстаецца вялікім поспехам у маленькіх чытачоў. Як пісаў паэт Шарль Вільдрак: «Каб захапіць юнага чытача, Арман Го адабраў лепшае ў сучаснай дзіцячай паэзіі, узяўшы пераважна творы аўтараў, якія і цяпер жывуць, мяркуючы, што ўвазе дзіцяці трэба перш за ўсё прапанаваць песні і мову часу, у які яно жыве...»

Лепшыя сучасныя французскія паэты і пісьменнікі, якія пішуць творы для дзяцей, прадстаўлены ў апошніх выданнях «Краіны Паэміі». Тут і дзеяностагадовы паэт Поль Фор, які не страціў да гэтага часу свайго ўмення глыбока пранікаць у душэўны свет дзіцяці, і юная паэтэса Сабіна Сіко. Тут і вершы цудоўнага дзіцячага паэта Рабера Дзясноса, актыўнага барацьбіта супраць нямецкіх фашыстаў, які загінуў у канцлагеры ў Тарэзіне. У гэтай кнізе змешчаны вершы Нікаласа Бадзюэна — віцэ-прэзідэнта таварыства французскіх паэтаў, вершы бельгійскіх паэтаў — Армана Бернье і Марыса Карэма, сучасных французскіх паэтаў Марты Аміо, Луі Гійома, Луізы Пален, П'ера Мусары, Марселя Мамлезы, П'ера Менанто і многіх іншых.

Творы Марыса Карэма, Армана Бернье перакладаліся на рускую мову, але большасць аўтараў кнігі «Краіна Паэмія» не былі вядомы савецкаму чытачу. Паэтэса Эдзі Агняцвет упершыню пазнаёміла нас з імі, пераклаўшы іх вершы для дзяцей на беларускую мову. *)

Калі супаставіць французскае выданне кнігі «Краіна Паэмія» з беларускім перакладам гэтай анталогіі, дык не цяжка заўважыць, што ў французскім арыгінале няма вершаў Віктара Гюго «За барыкадаю», П'ера-Жана Беранжэ «Жак», Луі Арагона «Французскі марш» і Поля Элюара «Свабода».

Тут перакладчыца дапусціла пэўную вольнасць, уключыўшы ў беларускае выданне «Краіны Паэміі» тое, чаго няма ў французскім зборніку. Аднак гэтая вольнасць, на нашу думку, цалкам апраўдана. Сваімі перакладамі вершаў Гюго, Беранжэ, Арагона і Элюара Эдзі Агняцвет дала магчымасць беларускім дзецям прачытаць на сваёй роднай мове вершы класікаў французскай паэзіі і лепшых прагрэсіўных сучасных паэтаў, творы якіх прасякнуты грамадзянскім пафасам і гарачай любоўю да людзей з народа.

Вялікай творчай удачай паэтэсы трэба прызнаць вельмі цяжкі пераклад класічнага верша Віктара Гюго «За барыкадаю», які ўвайшоў у многія школьныя хрэстаматыі. Парыжскі хлопчык, якога версальцы хацелі расстраляць у час крывавай расправы над камунарамі ў 1871 годзе, паўстаў перад намі як сапраўдны герой тых далёкіх дзён:

У старажытных грэкаў
на медалі
Тваё імя, напэўна б, выбівалі.
І там, пад ясным запалістым небам,
Ты б усміхаўся ручаю, цяністым
вербам.
І з поўным збанам на плячы
дзяўчына
Забылася б на тое, што павінна
Выкуй гарачых напаіць вадой,—
Глядзела б доўга ўслед табе, герой!

Эдзі Агняцвет упершыню перакласла на беларускую мову двух сучасных французскіх паэтаў — Луі Арагона (верш «Французскі марш», прасякнуты нянавісцю да фашызму) і Поля Элюара (верш «Свабода»).

Напісаны белым вершам элюараўскі верш «Свабода» асабліва добра перакладзены беларускай паэтэсай. Вось яго пачатак:

На сшытках маіх вучнёўскіх,
На парце маёй і на дрэвах,
І на пяску, і на снезе—
Я пішу тваё імя.

На ўсіх друкаваных аркушах
І на старонках белых,
На камні, крыві і попеле—
Я пішу тваё імя.

На пазалочаных рамках,
На зброі байцоў адважных,
На каралеўскіх каронах —
Я пішу тваё імя...

Зборнік «Краіна Паэмія» складаецца з некалькіх раздзелаў: «Французскі марш», «Пад родным дахам», «Кніга прыроды», «Светлячок» і «Пупэт і Патата».

Ва ўсіх гэтых раздзелах Эдзі Агняцвет паказала сваё высокае майстэрства перакладчыцы. Яно праявілася, напрыклад, пры перакладзе вершаў Рэмі дэ Гурмона «Рака», Жанны Марвіг «Крыніца», Марыса Карэма «Крыкі птушак», Армана Бернье «Дзіця і птушка» і многіх іншых.

Ёсць у гэтай анталогіі раздзел,— ён называецца «Пупэт і Патата» — які патрабуе ад перакладчыка асабліва тонкага майстэрства. Тут сабраны вельмі лаканічныя і вельмі ёмістыя вершы для самых маленькіх чытачоў, прасякнутыя гумарам і іроніяй. Перакладаць іх вельмі цяжка. Бо трэба сродкамі іншай мовы перадаць афарыстычнасць арыгінала, яго часам складаную рытміку, хітраваты гумар дзіцяці і яго шчырасць. Вось, напрыклад, верш Жоржа Дзюсмеля «Звярынец», напісаны ў форме загадкі. Маленькі сын звяртаецца да бацькі:

Усё ты ведаеш, мой тата!
Ты кніжак прачытаў багата,
Чытаеш кожны дзень газеты,
Дзе ў добрых літарах—сакрэты.
Са мною, татачка, сядай,
Мае загадкі адгадай!
А лепей сам я
адгадаю
Усё-усё, аб чым спытаю!

Дзіця загадвала бацьку загадкі пра жыхароў звярынца — слана, чарапаху, малпу, кракадзіла і папугая, а ў самым канцы з дзіцячай хітрынкай пытаецца яшчэ пра аднаго звера, якога тата вельмі любіць. Хочаце ведаць — хто ён такі, гэты грозны звер? Дык вось слухайце:

Ён есць і п'е,
крычыць да слёз,
Кашуляй выцірае нос,
На дрэвы лазіць, на парканы,
Ён — нерахманы, неслухмяны,
І любіш ты яго, аднак...
Ах, тата,
гэта я—твой Жак!

Беларускай паэтэсе ўдалося не толькі адэкватна перадаць змест і форму верша, але і захаваць лёгкасць, прыгажосць і шчырасць арыгінала. Вось хіба толькі канцоўка верша не зусім дакладная, бо ў арыгінале імя сына не названа. Відаць, аўтар не меў на мэце канкрэтнае дзіця, а проста хацеў перадаць своеасаблівы дзіцячы гумар.

Мы ведаем, што Эдзі Агняцвет з'яўляецца аўтарам цэлага раду зборнікаў арыгінальных вершаў для дзяцей. Гэта зрабіла плённы ўплыў і на яе пераклады зарубежных дзіцячых паэтаў. Бясспрэчнае майстэрства паэтэсы і перакладчыцы праяўлялася пры перакладзе вершаў Марыса Карэма «Добрыя каралі», Трыстана Клінгсора «Песенька гарбуза» і «Люлі, кот на люлі!», напісаных у форме карагодных песень, вершаў-загадак Луі Гійома і вясёлага верша Шарля Вільдрака пра Пупэт і Патата:

Колькі зім і колькі лет,
У палацы, ля маста,
Пражываў кароль Пупэт
З каралевай Патата!
Ні балконаў, ні паверхаў
Там не ўбачыце нідзе!
З склепа лесвіца—для смеху—
У сталовую вядзе.
Па-та! тра-ля, о, любата!
Патапупэт і Патата!..

А колькі важнасці ў маленькага валавянага салдаціка з верша Трыстана Клінгсора, і хоць у гэтага салдаціка «бацька — збан, а маці — лыжка», тым не менш, ён марыў стаць капітанам і ажаніцца з драўлянай лялькай.

У вядомай кнізе Рамэна Ралана «Кала Бруньён» расказваецца легенда пра Жаваранка, якая вельмі ўдала, рытмічай прозай, перакладзена Э. Агняцвет.

Завяршаецца беларускае выданне анталогіі «Краіна Паэмія» перакладам старадаўняй французскай народнай песні-танца «Жыла-была пастушка...», якую перакладчыца запазычыла ўжо з другога зборніка. Але тым не менш гэтая дзіцячая песня-танец па праву заняла сваё месца ў цудоўнай краіне Паэміі.

Не ўсе вершы французскай кнігі ўвайшлі ў беларускі зборнік. Але пры новым выданні гэтай цікавай кнігі, нам здаецца, варта ўключыць і некаторыя вершы вядомага бельгійскага паэта Эміля Верхарна, а таксама асобныя вершы сучасных французскіх паэтаў, напрыклад, маленькі верш для дзяцей П'ера Мусары «Акрабат».

Пажадана было б даць да кнігі больш шырокую прадмову, чым тая, якая змешчана ў рэцэнзуемым выданні, — бо большасць аўтараў, вершы якіх перакладзены Э. Агняцвет, мала вядомыя нашаму чытачу, і пра іх варта было б сказаць больш падрабязна.

Н. ЛАПІДУС,
кандыдат філалагічных навук.

«Краіна Паэмія». Пераклад з франц. Э. Агняцвет. Мінск. 1962 г.

Маякі культурнага фронту

ШЧЫРА ДЗЯКУЮ

У гарадскім пасёлку Плешчаніцы, на вуліцы Вароўскага, стаіць цагляны будынак раённай кнігарні, добра знаёмы кожнаму рабочаму і служачаму гарадскога пасёлка, хлебаробам навакольных калгасаў і саўгасаў, школьнікам.

Тут заўсёды шмат людзей. Вось да прылаўка Ніны Каспяровіч падыходзіць пажылы чалавек:

— Скажыце, калі ласка, што ў вас ёсць па агратэхніцы вырошчвання цукровых буракоў?

— Ёсць кнігі і брашуры, — адказала Ніна і дадала: — У нас асобны стэнд прысвечаны гэтаму. — Яна праводзіць пакупніка да стэнда і памагае выбраць патрэбную літаратуру.

Наведвальнік — галоўны аграном саўгаса «Іскра» Цімафей Іванавіч Крупень — узяў некалькі кніг і сказаў:

— Шчыра дзякую. Мне якраз і патрэбны былі кнігі пра тое, як вырошчвае цукровыя буракі Марк Святлічны.

Дзесяткі, сотні людзей штодзень прыходзяць у Плешчаніцкую кнігарню. Вялікім попытам тут карыстаюцца творы Гейнэ і Бальзака, Пушкіна і Талстога, Горкага і Маякоўскага, Купалы і Коласа, сельскагаспадарчая і навукова-папулярная літаратура. Магазін з месяца ў месяц перавыконвае планы продажу кніг. Напрыклад, летась у кнігарні прададзена рознай літаратуры на 22 500 рублёў (план 19 тысяч).

Што ж стварае поспех у рабоце?

— Асаблівых сакрэтаў у нас няма,— гаворыць прадаўшчыца Вольга Уткіна. — Проста — працуем, стараемся...

Іменна стараннасць работнікаў кнігарні — зарука поспеху. Аб ёй сведчыць ужо нават парадак у самім магазіне. Не знойдзеш тут кніг пад прылаўкам ды па розных кутках. Усе яны акуратна расстаўлены на стэлажах і стэндах: кожная на сваім месцы. Вось аддзел беларускай кнігі — паэзія, проза, бібліяграфічна-крытычная літаратура. У кнігарні можна купіць кнігі папулярных пісьменнікаў братніх сацыялістычных краін, а таксама прагрэсіўных літаратараў капіталістычных краін. Ёсць аддзелы палітычнай, сельскагаспадарчай і іншай літаратуры.

Работнікі кнігарні заўсёды цікавяцца навінкамі літаратуры, стараюцца своечасова набываць іх. Ніна Каспяровіч і Вольга Уткіна самі многа чытаюць, і таму заўсёды могуць дапамагчы пакупніку: даць анатацыю на тую ці іншую кнігу, расказаць пра яе аўтара, наогул, парэкамендаваць, што купіць.

У рабоце дзяўчатам памагае шматлікі актыў — сапраўдныя кнігалюбы. Гэта ў першую чаргу — школьнікі старэйшых класаў першай і другой школ гарадскога пасёлка Галя Каспяровіч, Тома Дубаневіч, Галя Беляковіч, Зоя Сівец, а таксама піянерважатыя Ларыса Беляковіч і Ніна Бабароўская. Яны — кніганошы. Кожны вучань абавязаўся прадаць на дзесяць рублёў рознай літаратуры.

Актыўна памагае распаўсюджваць кнігі камсамол. Раённая кнігарня разам з райкомам камсамола ў апошні час правяла чатыры кніжныя базары ў гарадскім пасёлку і буйнейшых населеных пунктах, на якіх было прададзена сотні кніг. З поспехам прайшла таксама дэкада палітычнай і сельскагаспадарчай літаратуры.

Ніна Каспяровіч і Вольга Уткіна не так даўно зрабілі яшчэ адну карысную і цікавую справу. Маладыя прапагандысты кнігі скамплектавалі асабістыя бібліятэчкі для работнікаў сельскай гаспадаркі, сувязі і школ. Вользе і Ніне былі шчыра ўдзячны аграном калгаса «Перамога» Уладзімір Верабей, настаўніца Ніна Мігдалева і іншыя, якія набылі ў кнігарні бібліятэчкі.

Наладзілі дзяўчаты і работу ларкоў без прадаўцоў. Цяпер іх у раёне пяць — у гасцініцы, чайной і іншых месцах.

Кніжныя базары, кніганошы, вусная і наглядная прапаганда кнігі, публічныя агляды літаратуры, канферэнцыі чытачоў, дыспуты — гэтыя і іншыя формы работы прыносяць поспех работніцам Плешчаніцкай кнігарні. Сёлета яны далі слова прадаць кніг больш чым на 25 тысяч рублёў.

Несці кнігі ў масы, быць палымяным прапагандыстам кнігі — з такою думкай, з такім жаданнем працуюць ударнікі камуністычнай працы Ніна Каспяровіч і Вольга Уткіна. І кожны пакупнік гаворыць ім:

— Шчыра дзякую!

М. БЕЛЬСКІ.

ПРАБЛЕМА СТАРАЯ І — НОВАЯ!

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

якіх, на іх думку, не вытрымліваюцца невядома кім устаноўленыя дозы дадатнага і адмоўнага, крытыкі, якія з ног на галаву ставяць усенародную праўду жыцця і вартасці твора не саромеюцца выдаць за хібы. Вядома, можна ашальмаваць кожны твор, можна яго замаўчаць, але ўсё ж, калі ён надрукаваны, нельга навязаць чытачу несправядлівую ацэнку яго, бо і сапраўды чытач наш вырас для таго, каб самастойна адрозніць праўду ад паклёпу. Крытык жа, які адважваецца, каб дагадзіць кан'юнктуры, выступіць супраць мастацкай праўды, мякка кажучы, проста страчвае ўсякі давер да сябе.

Праўда, я схільны дапусціць, што цяпер, ва ўмовах, калі многае змянілася, адстаялася і прояснілася, калі з'явіліся і атрымалі шырокае прызнанне таленавітыя і смелыя рэчы рускай літаратуры, цяпер многія з былых беспрынцыпных аматараў аглабельнай расправы над праўдзівымі творамі проста развядуць рукамі — маўляў, хто ж ведаў, што ўсё так абернецца, што з'явіцца ў «Новом мире» з дазволу Прэзідыума ЦК КПСС «Адзін дзень Івана Дзянісавіча» і многае іншае. Гэта так. Наватарскія і праўдзівыя творы, бывае, задаюць шмат клопату. Куды прасцей было з такімі рэчамі, як «Святло над зямлёй», «Шырокія гарызонты», але чаго ж варты тады людзі, якія страцілі прынцыповасць і ператварыліся ў прыказчыкаў кан'юнктуры.

Для таго, каб літаратура ў меру сваіх сіл дапамагала грамадству на яго шляху да прагрэсу, мала аднаго адлюстравання дадатнага (хоць важнасць станоўчага ў літаратуры бясспрэчна), трэба яшчэ і даследаванне ганебнага, рабскага, якое прыніжае чалавечую годнасць. Двуадзінасць гэтай канцэпцыі, відаць, ні ў каго не выклікае пярэчання, але суадносіны аднаго з другім у кожным канкрэтным выпадку павінен вырашыць толькі аўтар у адпаведнасці са сваім эстэтычным густам, сваім характарам, стылем сваёй творчасці, урэшце ў адпаведнасці з тэмаю і матэрыялам. Тут вялікую важнасць набываюць магчымасці аўтарскага самавыражэння, якое толькі і можа ўдыхнуць у твор самабытнасць і без якога творы становяцца блізнятамі.

Менавіта з гэтай прычыны шматлікія творы культаўскага часу былі такія нівеліраваныя, як спіты чай, пазбаўленыя паху і смаку, і менавіта з прычыны паглыбленай увагі да чалавечай асобы так свежа загучалі вобразы ў творах маладых — І. Пташнікава, Б. Сачанкі, М. Стральцова, В. Адамчыка, Ул. Дамашэвіча. (Зразумела прычына гэтага і ў іх таленце, таксама як і ў тым, што маладзейшыя ў найменшай меры зведалі на сабе многае, што поўнаю доляй даталося за гады культу старэйшым). Як бы там ні было, здавалася б, усім нам варта толькі радавацца гэтай з'яве ў літаратуры. Аднак жа і тут не абышлося без «праработкі», без вокрыкаў і недаверу. І няўцям гэтым праработчыкам, што, напрыклад, «заганныя», «неўладкаваныя», «рэфлекціруючыя» героі Б. Сачанкі куды больш выяўляюць чалавечае ў чалавеку, чым цэлая гагорта зусім станоўчых, але па сутнасці надуманых і фальшывых персанажаў з шматлікіх нарысаў, якія амаль што нечытаныя ўхваляюцца, выдаюцца і затым мёртвым грузам марнеюць на складах кнігагандлю.

Дарэчы, хіба можна патрабаваць ад літаратуры, як і наогул ад кожнага з мастацтваў, неадкладных вынікаў яе ўздзеяння? Толькі людзі зусім далёкія ад разумення прыроды мастацтва могуць так утылітарна і вузка ставіцца да найскладанейшай галіны чалавечае дзейнасці і прынароўліваць мастацкія творы да патрэб дня, моманту, кан'юнктуры. Гэта ж агульнапрызнаны, хоць на першы погляд і парадаксальны факт, што, напрыклад, «Анна Карэніна», створаная, як вядома, у рэчышчы крытычнага рэалізму і да таго ж на тэму жыцця чужога нам класа, дапамагае ў выхаванні чалавека непамерна лепш, чым напісаныя з улікам усіх, але часам сумніцельных патрабаванняў сучаснасці шмат якія тоўстыя раманы (нават і апошніх год).

У наш час трэба хіба што заплюшчыць вочы, каб перастаць бачыць няўтольную цягу да праўды ва ўсіх сферах інтэлектуальнай творчасці. Без праўды немагчыма мастацтва. І тут, вядома, не абысціся без пошукаў новай формы, якая б з найбольшай ёмістасцю акумулявала і з найменшымі стратамі данесла б да мільёнаў гэтую праўду. У выяўленчым мастацтве нараджаецца новы, адметны ад шматгадовага стыль адлюстравання рэчаіснасці, асноўны характар якога можна характарызаваць як максімальна набліжаны да жыцця рэалізм. Агрубленасць сілуэтаў, своеасаблівы, пазбаўлены натуралістычнага «прыгожага» каларыт, знарокавая імітацыя няўмеласці, нязграбнасці ў графіцы ёсць не што іншае, як імкненне да непасрэднасці, аб'ектыўнасці, да перадачы істотнага, унутранага ў чалавеку. У гэтым, вядома, шмат ідзе ад рэакцыі на памлезна-прылізаны стыль культу, калі не столькі чалавек, колькі яго становішча, выгоды яго дабрабыту былі прадметам мастацтва. Адзінства імкненняў да праўдзівага не можа не з'ядноўваць нас, літаратараў і мастакоў, і шкода, што мы ўсё ж дрэнна ведаем творчасць адзін аднаго, скупа ўзаемаўзбагачаемся, часта ўзаемаабыякавы да нашых пошукаў. Крыўдна бачыць у кніжках і часопісах ілюстрацыі, якія не толькі не дапамагаюць уяўленню чытача, а скажаюць яго, бо здараецца, відаць, што мастакі не чытаюць тое, што ілюстрыруюць, дык дзе ўжо тут дакопваццa да ўнутранай сутнасці вобразаў. Мы плацім ім тым жа.

На апошняй рэспубліканскай мастацкай выстаўцы экспанавалася карціна М. Данцыга «Навасельцы». Варта хоць крыху пастаяць перад гэтым творам нават чалавеку, недасведчанаму ў тонкасцях мастацтва, каб зразумець, што твор гэты — выдатны ў многіх адносінах, а галоўнае — у сваёй ціхай, сціплай і сардэчнай праўдзівасці. Толькі светлай душы, чуйнай да чалавечых болей і радасцей, дадзена было падгледзець такую, на першы погляд, звычайную сцэнку жыцця і гэтак таленавіта і лаканічна ператварыць яе ў мастацкі твор. У гэтай карціне радуе дакладна і без прэтэнзій выражаная сучаснасць ва ўсім. Я не ведаю ў беларускім жанравым жывапісу нічога, дзе б з большым майстэрствам спалучалася сучаснае — і ў каларыце, кампазіцыі, лаканізме выяўленчых сродкаў, і ўрэшце ў глыбокай яе чалавечнасці, як бы сканцэнтраванай з асабліваю сілай у фігуры дзяўчыны. Навокал было нямала добрых работ («Хлеб» М. Савіцкага, «Вясна» А. Малішэўскага і інш.), аднак «Навасельцы» М. Данцыга лепшая за ўсё. Але ці заўважыў гэта хто з нас, літаратараў, ці паспрабаваў хто напісаць пра гэты твор у друку, ці напісаў хто аб ёй у «Советскую культуру», якая ў інфармацыі аб выстаўцы сярод пералікаў шматлікіх твораў пра гэту работу нават не ўспамінае.

Эстэтычная глухата да лепшых нашых здабыткаў, а часам і проста грамадзянская абыякавасць не ўзбагачае наш інтэлект, калі не сказаць болей. У гэтым сэнсе нельга не заўважыць пісьменніцкую і грамадзянскую інертнасць некаторых нашых старэйшых літаратараў да пытанняў сучаснай нацыянальнай літаратуры. Мякка кажучы, здзіўляе іх безуважнасць да хвалюючых і кардынальных літаратурных праблем, умяшанне ў якія іх, людзей з аўтарытэтам і вялікім вопытам, засцерагло б агульную справу ад шматлікіх хібаў. Сапраўды, хто і дзе з старэйшых надрукаваў артыкул аб надзённых пытаннях нашага мастацтва або рэцэнзію на кнігу маладога літаратара? Мне асабіста памятаецца за апошнія 10—12 год толькі адзін выпадак такой зацікаўленасці — гэта рэцэнзія Піліпа Пестрака на першы зборнік Рыгора Барадуліна. Яшчэ некалькі слоў аб маладых надрукаваў Міхась Лынькоў. Болей падобных прыкладаў, здаецца, няма.

Літаратура — справа старая. Вопыт шматлікіх пакаленняў яе стваральнікаў усіх нацый шмат чаму вучыць. Варта, мабыць, часцей азірацца назад, варушыць гістарычныя прыклады, і ў мінулым знойдзецца многа адказаў на праблемы сучаснага. Было б толькі жаданне паказаць праўду жыцця. Служыць народу можна па-рознаму, з рознаю мерай аддачы, і калі ўжо казаць пра матыў пераадолення, закрануты ў артыкуле Б. Бур'яна, дык, відаць, шмат каму з тых, хто становіцца літаратарам, перш за іншых трэба намагчыся, каб пераадолець у сабе ўсё, што перашкаджае шчырасці і праўдзівасці. З гэтага і пачынаецца мастацтва.

Складаны наш век, складаныя яго праблемы. Лясканне зброі часта парушае спакой і цішыню заваяванага крывёю міру. І ў такі час, ясна ўсведамляючы сваю пісьменніцкую адказнасць перад чалавецтвам, вельмі хочацца творамі апраўдаць так цяжка здабытае права на праўду, без якой горкі смак жыцця і робіцца анемічным мастацтвам.

Падпісана да друку...

— Што выдадзена і якія кнігі яшчэ выйдуць у першым квартале гэтага года? — з такім пытаннем звярнуліся мы ў рэдакцыю мастацкай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва БССР?

— Дзякуючы таму, — сказаў загадчык рэдакцыі Алесь Бажко, — што цэнтр цяжару ў нашай рабоце перанесены з плана выпуску на планы рэдакцыйнай падрыхтоўкі, нам удалося паскорыць працэс выхаду кнігі. З пачатку года выйшла ў свет пятнаццаць розных выданняў—калектыўны зборнік «Дружбай мы з'яднаны назаўжды», «Выбранае» Байрана, кніга крытыка Уладзіміра Калесніка «Час і песня», апавяданні М. Ткачова, аповесць І. Клаза, нарысы Ул. Барно, вершы Х. Мальцінскага (пераклады з яўрэйскай), першыя кнігі маладых аўтараў — зборнік гумарэсак «Старыя знаёмыя» І. Аношкіна і раман «Чэсць ярма не прымае» М. Кругавых і інш.

—Што падпісана ў апошнія дні да друку?

— Значная колькасць самых розных па жанру і характару кніг. Чарговы, сёмы том Збору твораў Якуба Коласа і выбраныя вершы М. Васілька, кніга Ул. Караткевіча «Леаніды не вернуцца да зямлі» і зборнік беларускай сатыры «Пад корань», п'есы І. Козела і аповесць «Стэп наросхрыст» П. Беразняка. Падпісана да друку некалькі кніг паэзіі. Тут — і зборнік вершаў Аляксея Коршака, які загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны, і вершы Міколы Аўрамчыка, і Еўдакіі Лось, і першыя кнігі маладых паэтаў Васіля Макарэвіча і Міхася Рудкоўскага.

— Якія яшчэ кнігі будуць выпушчаны выдавецтвам да канца квартала?

— Рыхтуюцца да друку і выйдуць у свет да канца квартала восьмы том твораў Якуба Коласа, калектыўны зборнік вершаў, прысвечаных партыі і Ул. І. Леніну, кніга лірыкі Максіма Танка, зборнікі новых вершаў Ніла Гілевіча і Антона Бялевіча. Гэта з паэзіі. З прозы рыхтуюцца да друку апавяданні невядомага шырокаму чытачу, але цікавага беларускага пісьменніка В. Сташэўскага, раман С. Прошына «Я забыў пра цішыню», зборнік артыкулаў пра беларускіх пісьменнікаў Г. Кісялёва, праца М. Грынчыка «М. Багдановіч і народная паэзія» і інш.

Сёння мы знаёмім чытача з некаторымі творамі з тых кніг, якія неўзабаве выйдуць у свет.

ПЕСНЯ НЕ ПАМІРАЕ

На паліцах кнігарань хутка з'явіцца зборнік вершаў Аляксея Коршака «Апаленыя пялёсткі». Паэта няма сярод нас. Роўна 18 гадоў таму назад, 27 лютага 1945 года, смелы разведчык Аляксей Коршак загінуў ва Усходняй Прусіі ад фашысцкай кулі. Яму ішоў тады дваццаць пяты год.

Зборнік «Апаленыя пялёсткі» адкрываецца «Словам пра сябра» Сцяпана Александровіча.

Пры жыцці, — піша С. Александровіч, — здольны малады паэт Аляксей Коршак (1920—1945) надрукаваў толькі некалькі вершаў і рэцэнзій у газеце «Літаратура і мастацтва». Пасля яго смерці паасобныя творы публікаваліся ў часопісах «Полымя», «Беларусь», «Маладосць», у зборніку «Мы іх не забудзем», «Анталогіі беларускай паэзіі».

Вершы А. Коршака вызначаюцца нейкім асаблівым шчырым лірызмам, настраёвасцю і сардэчнай цеплынёй. Гэта творы пра вялікае сяброўства, студэнцкае жыццё, юнацкія пачуцці, красу маладосці.

Песню я спяваю
Аб жыцці, аб шчасці, аб вясне, —

пісаў А. Коршак у адным са сваіх вершаў.

Паэт-лірык А. Коршак валодаў уменнем праз простую і маленькую мастацкую дэталь перадаць вялікія пачуцці савецкіх людзей («Ластаўка», «На усходзе рой высокіх зорак»).

Аляксей Коршак па складу свайго паэтычнага таленту быў найбольш блізкі да Максіма Багдановіча, у яго ён вучыўся майстэрству, яму прысвяціў адзін з лепшых сваіх вершаў. Услед за сваім настаўнікам ён прабаваў свае сілы ў класічных формах («Вечар», «Трыпціх»), умела выкарыстоўваў народную паэтыку («Пячнік», «Ноч», «Паранены»).

Малады паэт, які бязмежна любіў сваю радзіму і жыццё, быў поўны светлых мар аб чалавечым шчасці і творчай працы, добра разумеў, якія цяжкасці ў барацьбе з ворагам кладуцца на плечы таго пакалення, да якога ён належаў. Таму нават у даваенных творах А. Коршака сям-там прарываецца трывожны акорд, нібы прадчуванне вялікага выпрабавання, якое выпадзе і на яго долю.

Ах, не дарэмна, любы мой таварыш,
Даецца нам кароткае жыццё, —

гаварыў паэт і спяшаўся зрабіць як найбольш.

У гады вайны мужнеў і гартаваўся паэтычны голас А. Коршака. Шкада толькі, што не ўсё з яго творчай спадчыны гэтага часу захавалася і дайшло да нас. Але такія вершы, як «Гарачынь», «Расстрэл», «О, бедны народ мой!..», «Зварот дамоў», гаварылі, што паэт не толькі зброяй, але і сілай свайго мастацкага слова змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Яшчэ напярэдадні вайны А. Коршак падрыхтаваў невялікі зборнік «Пялёсткі», рукапіс якога захаваўся ў яго бацькоў. З вялікай патрабавальнасцю ён паставіўся да сваёй творчасці і адабраў для кнігі найбольш істотнае і, на яго погляд, найбольш значнае. Сябры паэта ўключылі ў гэты зборнік і вершы ваеннага часу і назвалі кнігу «Апаленыя пялёсткі». Бо вайна апаліла сваім гарачым дыханнем паэтычныя радкі Аляксея Коршака, апаліла яго сэрца.

У вершы «Паранены», які цяпер гучыць як развітальная песня паэта з народам і Радзімай, ёсць такія радкі:

Я б закрыў навек спакойна вочы,
Каб мой любы край
Больш не ведаў злой пакутнай ночы,
Красаваў, як май.

Сёння, — заканчвае С. Александровіч, — калі, як май, красуе савецкая зямля, хочацца добрым і шчырым словам успомніць тых, хто аддаў сваё жыццё за шчасце Радзімы. Заслужыў права на гэта і таленавіты беларускі паэт-лірык Аляксей Коршак.

Аляксей КОРШАК

* * *

Равно и жить и умереть.
В. БРЮСОВ.

Там неба даль... А пад акном таполі.
Гартае вецер іх зялёныя лісты.
Бяры, чытай ты кожны подых волі,
І завучы усё на памяць ты.

Шпакі ўгары, і самалёт над гаем,
І спевы звонкія, і дзённы яркі гул...
Упала неба ў возера, дзе з краю
Квятчатых пахаў радасны разгул.

Плывуць галінкі бэзу і усмешкі
Людзей прыгожых, сэрцу дарагіх.
Пад ногі ім кладуцца шчасця сцежкі,
І сонца з вышыні вітае іх.

Адкрый жа дзверы, кроч на сцежкі тыя.
Сягоння ў сэрцах радасць не адна.
У тых вачах, што сонца сёння мые,
Ты чэрпай любасць ясную да дна.

Няхай не засцяць сонца нам аблокі
І растае начэй празрысты дым.
Блукай між сэрцаў блізкіх і далёкіх
І сып усмешкі цветам залатым.

Зірні — тваё сяброўства паміж імі,
Каханне сінявокае пайшло.
І от за тымі вербамі крывымі
Гармонік зазвіней на ўсё сяло.

І хораша, і хораша на сэрцы,
І тоне ў радасці прачытаны дакор.
Хіба ўсё роўна жыць тут і памерці,
Калі ў грудзях і воля і прастор!

ПАРАНЕНЫ

От і ўсё. За светлы край азёрны,
За вясну ў палёх,
Неба сіняе у кроплях зорных
Я навек тут лёг.

Нада мной шуміць ракіта квола,
Пада мной трава.
Сыплецца на сэрца невясёлая
Злой тугі жарства.

Бачу неба сіняе і блізкае
У астатні раз.
Меншыцца яно, маланкай бліскае,
Пачарнела ўраз.

Дзесьці плача кнігаўка... Ці маці...
Мама, бліжай сядзь.
Хачу глянуць, хоць крыху абняці —
Галавы не ўзняць.

Што ж ты не прытулішся, матуля!
Не мяне хоць глянь,
Гіне сын героем твой ад кулі,
Каб квітнела рань.

Што з табою! Плачаш! З воч блакіту
Цэлы лівень слёз.
. . . . . .

Я расплюшчыў вочы. Спіць ракіта,
Дождж шуміць між лоз.

Плача кнігаўка ўгары, як маці
Па дачцы ў труне.
Птушанька мая ты, кінь рыдаці,
Не шкадуй мяне.

Я б закрыў навек спакойна вочы,
Каб мой любы край
Больш не ведаў злой пакутнай ночы,
Красаваў, як май.

Каб хадзіў навокал спеў мінорны,
Што я ў бітве лёг
За прыгожы родны край азёрны,
За вясну ў палёх.

1942 г.

ВЕЧАР

(Санет)

Калі сканае сіратлівы вечар
І згасне ў шыбах чырвань спелых фарб,
Адчыніць неба залацісты скарб:
Збярэцца зор многакалёрных веча.

І месяц паміж хмар, нібыта карп,
У невад трапіўшы, ледзь-ледзь трапеча,
Плыве кудысьці ўдалеч шляхам Млечным
Без ветразяў, без компасаў і карт...

Ты адчыні акно часінай гэтай,
Глядзі ўгару, у зорную вышынь,
Там караваны зор, там неба сінь,
Там далі таямнічыя сусветаў...

І ў сэрцы, поўным ціхага агню,
Народзіцца імкненне ў вышыню,

Малюнкі мастака І. Давідовіча да кнігі А. Вялюгіна «Вецер з Волгі», якая выходзіць у Дзяржаўным выдавецтве БССР.

ПРЫВІДЫ ЗНІКАЮЦЬ

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ

У новую кнігу Ул. Караткевіча «Леаніды не вернуцца да зямлі» ўваходзяць аднайменны раман, які друкаваўся ў «Полымі» пад назвай «Нельга забыць», і невядомая яшчэ чытачу аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха». Змест аповесці складаюць успаміны старога фалькларыста і этнографа (ад яго імя вядзецца апавяданне) аб падзеях, якія адбыліся больш як паўстагоддзя таму назад. У пошуках новых легенд і паданняў вучоны трапіў у маёнтак паноў Яноўскіх. І тут ён становіцца сведкам падзей, якія разгортваюцца ў барацьбе за спадчыну Яноўскіх, дамагаецца, стараючыся дапамагчы маладой гаспадыні маёнтка Надзеі Яноўскай, сарваць маску таямнічасці з розных «зданяў і прывідаў», у тым ліку, і з «дзікага паляванне караля Стаха». (Згодна летапісу, які трапіў у рукі героя аповесці, Раман Яноўсні забіў некалі самазванага караля Стаха). «Дзікае паляванне» караля нібыта і праследуе за гэта ўвесь род Яноўскіх, у прыватнасці, апошняе яго пакаленне — Надзею Яноўскую.

Ніжэй мы змяшчаем два раздзелы з новай аповесці Ул. Караткевіча.

Аеньчык свечкі маячыў недзе далёка за цёмнымі шыбамі. Калі я падымаў вочы, я бачыў поруч з ім адбітак свайго твару з рэзкімі ценямі ў вачаніцах.

Я разбіраў паперы Бермана. Мне здавалася ўсё ж, што я змагу адшукаць у іх нешта цікавае. Берман быў занадта складаны характар, каб жыць простай авечкай.

І вось я, з ведама гаспадыні, выцягнуў усе паперы з бюро на стол, пераклаў на яго ж кнігі, лісты, дакументы і сядзеў, чхаючы ад пылу, які густа ўкрываў гэтыя рэліквіі.

Цікавага было, аднак, мала. Трапіўся ліст ад маці Бермана, дзе яна прасіла аб дапамозе, і чарнавік ліста Бермана ёй, дзе ён пісаў, што на яго ўтрыманні знаходзіцца брат, што брат цяпер не перашкаджае маці жыць так,як яна хоча, а ў астатнім яны — квіты. Гэта было дзіўна, які брат, дзе ён зараз?

Пасля я адшукаў нешта накшталт дзённіка, дзе, поруч з грашовымі выдаткамі і вельмі разумнымі заўвагамі па беларускай гісторыі, я прачытаў і такія-сякія разважанні Бермана. Вось некаторыя:

«Паўночна-Заходні край як паняцце — фікцыя. Справа, магчыма, у тым, што ён крывёй і мозгам сваім служыць ідэі цалкам усяго космасу, а не пяцёх губерань, расплачваецца за ўсё і гатуе ў глыбіні сваёй новага Месію для ўратавання людской пароды. Таму яго лёс — ўратаванне людской пароды. Таму яго лёс — пакутаваць. Справа, аднак, не датычыцца лепшых яго прадстаўнікоў, людзей сілы, арыстакратаў духу».

— Бач ты, рыцар духу, чалавек сілы ў прадзёртых портках, — буркнуў я.

«Адзіная любоў мая — брат. Часам мне здаецца, што ўсе астатнія людзі ёсць карыкатуры на яго, і патрэбны чалавек, які перарабіў бы ўсіх на яго капыл. Людзі павінны быць людзьмі цемры. Тады ў іхніх арганізмах лепей высоўваецца наперад тое цудоўна-жывёльнае, што мы павінны зберагаць і любіць. Хіба геній не аддзяляецца ад ідыёта толькі фігавым лістком, які прыдумалі самі людзі. Беларэцкі мяне раздражняе сваёй звычайнасцю і, дальбог, для яго было б лепей, каб ён хутчэй знік». І яшчэ адзін запіс:

«Грошы — эманацыя чалавечай улады над статкам іншых (на жаль!). Трэба было б навучыцца рабіць мазгавую кастрацыю ўсім, хто не варты свядомага жыцця. А лепшым даваць бязмернае шчасце, бо такая штука, як справядлівасць, не прадугледжана самой прыродай. Так і са мною. Мне патрэбен спакой, якога тут больш, ніж дзе-небудзь, і грошы, каб вынасіць ідэю, дзеля якой я з'явіўся на свет, ідэю вялікапышнай і надзвычайнай несправядлівасці. І мне здаецца, што першай прыступкаю магла б быць перамога над тым, да чаго імкнецца мае цела і што, аднак, неабходна знішчыць, над гаспадыняй Балотных Ялін. Яна ўсё адно асуджана сляпым лёсам на знішчэнне. На ёй праклён, і гэты праклён спраўджваецца з'яўленнем дзікага палявання над мурамі палаца. Яна больш трывалая, ніж я думаў, дагэтуль, не звар'яцела. Кароль Стах слабы, і выправіць яго памылкі суджана мне. І, аднак, я раўную яе да ўсіх маладых людзей і асабліва да Беларэцкага. Учора страляў па ім і быў вымушаны на рэтыраду. Дрэнна страляю».

Наступны лісток.

«Магчыма, калі я выканаю ролю боскай сілы, вышэйшага панавання (бывала ж такое са звычайнымі смертнымі), духі зла пакінуць гэтыя мясціны, і я стану гаспадаром. Пераконваў калісь Беларэцкага, што галоўная небяспека — паляванне. А якая небяспека ад зданяў? Іншая справа Малы Чалавек.

Золата, золата! Тысячы панегірыкаў трэба спяваць уладзе тваёй над душамі людзей. Ты ўсё: пялюшка дзіцяці, купленае табою цела дзяўчыны, сяброўства, любоў і ўлада, мозг найвялікшых геніяў, нават прыстойная яма ў зямлі. І да ўсяго гэтага я праб'юся».

Я скамечыў паперкі і да болю сціснуў пальцы:

— Брыдота!

І раптам сярод іншых паперак рука мая натрапіла на складзены ў чатыры столкі аркуш пергаменту. Я расклаў яго на каленях і толькі галавою хітнуў: гэта быў план будынка ў Балотных Ялінах, план XVI стагоддзя. І на гэтым плане выразна было азначана, што слухавак у мурах палаца аж чатыры, і яны так схаваныя ў плафоне, што адшукаць іх ніяк нельга. Між іншым, адна з іх вяла ад сутарэнняў пад палацам да пакоя ля бібліятэкі (напэўна, каб падслухоўваць размовы вязняў), а другая злучала бібліятэку, закінутыя пакоі для слуг на першым паверсе і... пакой, у якім жыла Яноўская. Дзве другія былі невядома дзе: выхады іхнія былі ў калідоры, дзе жылі я і Яноўская, але далейшы іх ход быў старанна зацёрты пальцам.

Мярзотнік адшукаў план у архіве і схаваў яго.

І было яшчэ тое-сёе цікавае. У вонкавым муры палаца была пустэча: выразна быў адзначаны вузкі праход і тры нейкія клетушкі. А выхад з прахода быў намечаны якраз за павароткай калідора, дзе я калісьці аддзіраў дзверы ў сапраўды забітым пакоі.

Я лаяўся так, як ніколі ў жыцці. Шмат непрыемнасцей мінула б, калі б я абстукаў там сценкі, абшытыя панелямі. Але не позна было і зараз. Я схапіў свечку, глянуў на гадзіннік, (палова на адзінаццатую ночы) і хутка пабег пераходамі да свайго калідора.

Стукаў я, напэўна, з палову гадзіны, пакуль не натрапіў на месца, якое адказала на стук гулкім водгукам, быццам я лупіў у дно бочкі. Я шукаў на панелі месца, за якое можна ўзяцца і аддзерці яе ад астатніх, але дарэмна. Пасля пабачыў у адным месцы лёгкія драпіны, пакінутыя як быццам нажом. Таму я дастаў сцізорык і пачаў торкаць ім у ледзь прыкметныя шчыліны між гэтай часткай панелі і астатнімі. Даволі хутка мне ўдалося намацаць лязом нажа нешта, што паддавалася. Я націснуў мацней —нешта зарыпела, і пасля панель павольна пачала паварочвацца вакол свайго цэнтра, кажучы мне вузкую шчыліну. Я паглядзеў на адваротны бок панелі ў тым месцы, куды торкаў лязом — там была глухая дошка, знутры панелі адчыніць на калідор было нельга. Я нават спусціўся быў уніз прыступак на пятнаццаць, але дзверы за спіною жаласна заспявалі, я пабег да іх і якраз своечасова паспеў прытрымаць іх нагою, каб яны не захлопнуліся. Не, заставацца ў нейкай пацуковай нары аднаму, з пагрозай прасядзець тут да другога прышэсця, ды яшчэ з абгаркам свечкі — гэта было глупствам.

Таму я пакінуў дзверы напаўзачыненымі, паклаўшы ля восі ўласную хустку, а сам сеў непадалёку на падлогу, паклаўшы на калені рэвальвер. Свечку давялося загасіць, бо святло яе магло спудзіць істоту, калі б яна задумала вылезці з патаемнага ходу. І, аднак, свечка за павароткай калідора, якая гарэла ўсю ноч, хоць цьмяна, але асвятляла калідор, ды і ў акно ліўся няпэўны шэры водбліск.

Не ведаю, колькі я так праседзеў, уткнуўшы падбароддзе ў калені. Было каля дванаццаці, калі раптоўная дрымота пачала падаць на мяне, навальвацца цяжарам, стуляць павекі. І я ўпарта дзюбаў носам, як ні намагаўся змагацца са сном. Даліся мне ў знакі мінулыя бяссонныя ночы. У адзін з момантаў прытомнасць адмовіла мне, і я праваліўся кудысьці ў цёмную душную бездань.

Вы спрабавалі калі-небудзь спаць седзячы, прыціснуўшы спіну да мура або лепей да дрэва? Паспрабуйце. Вы пераканаецеся, што пачуццё падзення, якое вы чаемам адчваеце, лежачы пад цёплай коўдрай, ёсць шостае пачуццё, што перайшло нам у спадчыну ад продка нашага, малпы, што яно было ёй неабходна, каб не ўпасці з дрэва. І седзячы ля дрэва, вы ў сне будзеце падаць вельмі часта і адкрываць вочы і зноў засынаць. І нарэшце дзіўныя ены авалодаюць вашай душой, знікне мільён год чалавечага існавання і вам здасца, што пад дрэвам дапатопны мамант ідзе на вадапой і вочы пячорнага мядзведзя гараць з-пад скалы.

Прыблізна ў такім настроі быў і я. Сны. Сны. Мне здавалася, што я сяджу з доўбняю на каленях недзе на дрэве і мне страшна злезці, бо пада мною, па зямлі, ідзе нейкі пітэкантроп. І ноч, і стогнуць ваўкі за дрэвамі. У той самы момант я упэў і раскрыў вочы.

Проста ў паўцемры рухалася паўз мяне дзіўная істота. Зялёнае старадаўняе ўбранне было ў пыле і павуцінні, галава, доўгая, выцягнутая назад,як боб, задуменна апушчана, павекі, як у жабы, ледзь не закрывалі журботныя вочы, а рукі былі апушчаны ўніз, і доўгія-доўгія пальцы іх амаль даставалі да зямлі.

Малы Чалавек Балотных Ялін прамінуў мяне і праплыў далей, а я сачыў за ім з рэвальверам. Будынак быў яму, відаць, добра знаёмы. Ён адчыніў акно, пасля другое, пасля вылез у адно. Я высунуў за ім галаву і пабачыў, што гэта істота з малпячым спрытам ідзе па вузкім, у тры пальцы, карнізе. Ён амаль бег, як павук, з нечалавечай жвавасцю. Па ходзе справы ён адшчыкнуў з галіны ліпы, якая падыходзіла да сцяны, некалькі пдодзікаў. Пачамкаў іх. Адной рукою ён дапамагаў сабе рухацца. Пасля ён зноў пралез у калідор, зачыніў вокны і павольна рушыў кудысь калідорам, страшны ў сваёй нечалавечнасці. Аднойчы мне пачулася нейкае мармытанне. Малы Чалавек хлопнуў сябе па лобе і знік у цемры, куды не даставала святло далёкай свечкі. Я хутка накіраваўся за істотай, бо баяўся знікнення. Калі я апынуўся ў цемры, я пабачыў два ззяючых вокі, што глядзелі з кута з невымоўнай пагрозай.

Я кінуўся да яго, але яно застагнала цяжка і пабрыло кудысь, хістаючыся на нагах. Утаропіла на мяне свой позірк, пасварылася пальцам.

Аслупянеўшы на імгненне, я апамятаваўся, дагнаў Малога Чалавека і схапіў яго за плечы. І радасна страпянулася маё сэрца, бо гэта не была здань.

Калі я выцягнуў гэтую істоту на святло, яна торкнула сябе пальцам у рот і сказала няпэўным, рыпячым голасам:

— Гам-гам.

— Ты хто такі? — трасянуў я яго за плечы.

І Малы Чалавек, былая здань, адказаў завучана:

— Я Базыль, я Базыль.

І раптам хітрасць, якая бывае і ў ідыётаў, асвяціла яго вочы:

— Я вас... бачыў. Гы-гы! Я сядзеў пад сталом... пад сталом, брат мяне карміў. А вы раптам — шась!

І зноў зачамкаў вялізным, да вушэй, ротам.

Я зразумеў усё. Два мярзотнікі — кіраўнік дзікага палявання і Берман — дадумаліся, уласна кажучы, да аднаго і таго ж самага. Берман, які ведаў, што ён з'яўляецца сваяком Яноўскай, прыехаў у Балотныя Яліны і тут напаткаў план хадоў у мурах і слухавак. Пасля гэтага ён таемна паехаў у горад і, кінуўшы маці на волю лёсу, прывёз сюды брата, які не таму ўнікаў людзей, што любіў самоту. Брат проста быў непраўным ідыётам, і нездарма ў клубе здзівіліся яго дрэннаму выхаванню (Берман, вядома, прывёз у клуб не брата, а нейкага захожага чалавека). Калі ён прывёз яго сюды, ён змясціў яго ў сваім пакоі, карыстаючыся тым, што да яго ніхто не заходзіў, і загадаў сядзець ціха. Пад час аднаго з гадаванняў я і заспеў іх на месцы злачынства. Малы Чалавек пад час размовы сядзеў пад сталом, і я мог бы схапіць яго, працягнуўшы руку.

Уначы Берман заводзіў яго ў хады, і той крочыў па начных пераходах, абуджаючы ў слухаўках гукі, якія чулі жыхары дома.

Часам яго выпускалі і ў калідор: у гэтым выпадку ён апранаў назнарок пашыты стары ўбор, а Берман чакаў яго ля адчыненых дзвярэй ходу, бо адчыніць іх Малы Чалавек не мог. Часам яму дазвалялі пагуляць і на свежым паветры. З малпячым, а хутчэй павучыным спрытам, ён бегаў па карнізах будынка, глядзеў часам у асветленыя вокны і, у выпадку трывогі, маланкава знікаў за шматлікімі кутамі будынка.

Яму тым лягчэй было гэта рабіць, што ў яго пячорным мазгу зусім адсутнічаў інстынкт самазахавання. Ён ішоў па гэтым карнізе так раўнадушна, як мы часам, забаўляючыся, ідзём па чыгуначным рэльсе.

Пад час адной такой пагулянкі і адбылося яго спатканне са мною. Што ж здарылася пасля? «Лікол» даслаў мне ліст, у якім, каб выбавіць мяне з хаты, рэкнуў здуру, што ведае штосьці пра Малога Чалавека. Берман, які апошні час сачыў за мною, прачытаў ліст і пайшоў на месца сустрэчы, каб неяк дамовіцца з невядомым. Там яго палічылі за мяне, і адбылася трагедыя, познім сведкам якой я быў.

А Карла сядзеў усе гэтыя дні ў хадах, не маючы змогі вылезці, і зусім заслаб з голаду. Каб я не адчыніў дзверы — ён, напэўна, памёр бы, так і не здагадаўшыся, чаму пакінуў яго той, што заўжды яго гадаваў і песціў.

Што мне было рабіць з ім? Нячшасны малы ідыёт не быў вінен у тым, што яго стварылі такім на свет. Тут ён і выбывае з нашага апавядання. Я нагадваў яго, абвясціў Яноўскай аб канчыне аднаго з прывідаў, якія насялялі палац Балотных Ялін, і наступнага дня адаслаў яго ў павятовую бальніцу для вар'ятаў.

І ўпершыню гэтым вечарам я бачыў, як надзея загарэлася ў вачах гаспадыні Балотных Ялін цёплым, пакуль што яшчэ слабым агеньчыкам.

* * *

Вось і ўсё. Праз дзень упершыню за ўсе гэтыя дні сонца разам з лёгкім ранішнікам пала на балоты, пусткі, на старыя яліны парку, на замшэлыя муры маёнтка. Высокая трава была абсыпана белай халоднай пудрай і ружавела ад першых праменняў сонца. І муры былі ружовымі, нават памаладзелі, прачнуўшыся ад цяжкага сну, які вісеў над імі тры гады. Молада блішчалі вясёлкавыя шыбы, сонца кідала нягрэючыя праменні, і адхоны пацелі ад яго, трава на іх рабілася мокрай.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Еўдакія ЛОСЬ

МУЖНАСЦЬ

Услаўлена ў песнях суровая мужнасць!
Яе пазнавалі ў паходцы байца,
Яна гартавала працоўных садружнасць,
З нядужым, ды гордым, ішла да канца.

Стралялі ў яе — не баялася стрэлаў,
Марылі ў засценках — усё-ткі жыла...
Я мужнасць такую сягоння сустрэла,
І нават не там, дзе завеі, імгла.

І нават не там, дзе пільнуюць граніцу,
Дзе сеецца пыл недасяжных планет,
Куды загароджаны шлях баязліўцу,
А мужны раскрые спрадвечны сакрэт.

На цеснай трыбуне шырокае залы
Стаяла яна, пабляднелая ледзь...
Нервова паперак яна не гартала —
Чаканіла слоў непадатлівых медзь...

Гучала прамова на злосць крывадушным,
Кавалася подласці чорнай на злосць.
І дружныя воплескі ў зале той душнай
Казалі: ты з намі, ты наша, ты ёсць!

Міхась РУДКОЎСКІ

БАБІНА ЛЕТА

Бабіна лета гарыць пад акном —
Зоры, дый годзе, на градах цвітуць.
Пыхаюць белыя грудзі агнём,
Цяжка, ой цяжка кабеце заснуць.

Поўначчу ціхай над хатай ўдавы
Трубяць, удаль летучы, журавы.

Чуючы іх, ёй не спаць да відна:
Крыўдна і горка, што свой увесь век
Быццам вярба над ракою яна...
Ды на каго наракаць удаве!

Сват не адзін быў адпраўлены з хаты:
Доўга чакала жанчына салдата.

Верыла картам цыганкі і снам,
Верыла, вернецца любы дамоў.
Клалася ў косы яе сівізна —
Ён жа з вайны не ішоў... не прыйшоў...

Буйна штогод цвіло бабіна лета.
Вечнай салдаткаю стала кабета.

Сэрцу балюча: няўжо сапраўды
У тым і бяда і святая віна,
Што зберагла сябе праз гады
Ціха і горда, бы ў полі сасна,

Працай самоту сваю заглушала—
У печы паліла ды ў поле спяшала!..

Жоравы, змоўкніце вы ў цемнаце,
Дзікія, добрыя, досыць трубіць:
Бабіна ж лета сягоння цвіце —
Сэрцаў збалелых не трэба будзіць!

У нас на сяле ў кожнай хаце дзесятай
Не прычакала жанчына салдата...

Малюнкі мастака П. Астроўскага да кнігі Я. Вількіна «Незвычайныя прыгоды Генадзія Дзіагенава», якая выходзіць у Дзяржаўным выдавецтве БССР.

З розных шыроп

ШУКАЙЦЕ ДЖАКОНДУ

Ян ГЕРХАРД

□ □

Каралеўскія ўшанаванні, з якімі нядаўна праслаўленая Джаконда — Монна Ліза Леанарда да Вінчы адплыла за акіян у спецыяльнай раскошнай каюце трансатлантычнага гіганта «Франс» з Луўра ў Нью-Йорк, былі ўжо вычарпальна апісаны. Прыгадаем хіба толькі, што на абодвух берагах акіяна была выстраена ганаровая варта, аркестры выконвалі дзяржаўныя гімны, а прэзідэнт Кенедзі і французскі міністр культуры Мальро выступілі з прамовамі, у якіх было мноства палітычных намёкаў, бо што там ні кажы, мастацтва мастацтвам, а палітыкі адносяцца да тых людзей, якія стараюцца выкарыстаць кожны выпадак. Аднак толькі Монна Ліза як заўсёды загадкава ўсміхалася, усміхалася таксама стандартнай амерыканскай усмешкай Жаклін Кенедзі, а яе муж гаварыў у гэты час, што «Злучаныя Штаты павінны стварыць сваю нацыянальную ўдарную сілу ў галіне культуры», намякаючы на ядзерныя праекты прэзідэнта дэ Голя, што ў сваю чаргу выклікала кіслую ўсмешку міністра Мальро. Натоўпы прыхільнікаў праводзілі Джаконду ў Парыжы, натоўпы сустракалі яе ў Нью-Йорку, дзесяткі тысяч амерыканцаў штодзённа дэфілююць перад геніяльным творам Леанарда да Вінчы.

Уся гэтая падзея змясцілася б у газетнай хроніцы і некалькіх рэпартажах, калі б не другая падзея, якая не сыходзіць вось ужо шмат дзён со старонак французскага друку. Справа ў тым, што нейкі месье Гекінг, 77-гадовы антыквар і калекцыянер, які жыве ў Грас, каля Ніццы, склікаў у сябе прэс-канферэнцыю і заявіў, што ў яго ёсць другая Джаконда, такая ж сапраўдная, як у Луўры, а, магчыма, нават лепш напісаная. Купіў ён яе ў 1954 годзе ў гандляра старызнаю за дробязь — за 30 франкаў. Выдатныя італьянскія спецыялісты, якім ён паказваў карціну, пацвердзілі, што яна, як і луўрская Монна Ліза, таксама работы Леанарда да Вінчы. Так заявіў прафесар Джорджы Нікодземі, вядучы эксперт твораў генія Адраджэння і ахоўнік яго музея. Гекінг, аднак, пайшоў яшчэ далей і заявіў, што карціна, якая знаходзіцца ў яго, з'яўляецца арыгіналам XVI стагоддзя, а луўрская Джаконда — яе копія, зробленая пазней. Купленая Францыскам I у Леанарда да Вінчы ў 1502 г. за 12 тыс. тагачасных франкаў, яна была ўкрадзена з Луўра ў 1911 г. На думку Гекінга, Монна Ліза, знойдзеная пазней, аказалася спецыяльна падсунутай копіяй. Відавочцы сцвярджаюць, што копія, якая знаходзіцца ў Гекінга, вызначаецца больш яркімі і жывымі фарбамі, больш гарманічнымі рысамі твару Джаконды і яшчэ больш чароўнай усмешкай.

НЯЛЁГКАЯ СПРЭЧКА

Думкі ўдзельнікаў спрэчкі падзяліліся: адны лічаць, што сапраўдная луўрская Джаконда, а ў Гекінга яе копія, другія сцвярджаюць адваротнае, а трэція — што абедзве Джаконды сапраўдныя і з'яўляюцца варыянтамі адной і той жа тэмы.

Спецыялістам цяжка вырашыць гэтую спрэчку, бо на свеце існуе не больш 25 карцін Леанарда да Вінчы, таму вельмі нялёгка выпрацаваць неабходны комплекс характэрных рыс, на аснове якіх можна было б неабвержна давесці, што той або іншы твор напэўна з'яўляецца творам гэтага мастака. Такой думкі прытрымліваюцца французскія спецыялісты, якія сёння паводзяць сябе неяк дзіўна...

Перш за ўсё кідаецца ў вочы адсутнасць якога-небудзь афіцыйнага абвяржэння заяў Гекінга. Кідаецца ў вочы і тое, што ўсё гэта стала вядома толькі цяпер, калі такую шуміху вакол Джаконды выклікала яе падарожжа ў Злучаныя Штаты. У Гекінга ж карціна знаходзіцца з 1954 года. Чаму ж да гэтага часу маўчаў ён, і міністр Мальро, і ўся дырэкцыя Луўра, якая вельмі добра ведала пра гэта? Якія прычыны так нечакана выклікалі гэтую дыскусію і чаму?

У колах французскіх мастакоў і мастацтвазнаўцаў шмат гавораць на гэтую тэму. Варта прыгадаць, што калі міністр Мальро заявіў пра падарожжа Джаконды ў ЗША, у Парыжы выбухнула сапраўдная бура пратэстаў. Чуліся галасы мастакоў і мастацтвазнаўцаў, якія заяўлялі, што калі амерыканцы хочуць бачыць Джаконду, няхай прыяджаюць у Луўр, што такія каштоўныя карціны не пазычаюць і г. д. Пры выпадку прыпаміналі, што розныя французскія ўрады прадалі амерыканцам сотні дарагіх карцін. Яшчэ жывыя ў памяці часы, калі амерыканскія мільянеры куплялі ў музеях і ў прыватных уласнікаў цэлыя сярэдневяковыя замкі і вывозілі іх у разабраным выглядзе за акіян. «Ці вернецца да нас Джаконда?» — пыталіся аўтары артыкулаў.

ЦІ САПРАЎДНЫЯ КАРЦІНЫ?

Мы даходзім да сутнасці спрэчкі. У Францыі ёсць колы, якія, магчыма, хацелі б задаволіць жаданне Амерыкі мець у сваіх музеях найвялікшыя творы мастацтва. Аб продажу Джаконды не можа быць і гаворкі — французская грамадскасць не дапусціць гэтага. Але калі існуе другая Джаконда і таксама сапраўдная? Тады пытанне яснае. Адна Монна Ліза ўпрыгожвае Луўр, другая — музей у Нью-Йорку. І ваўкі сытыя і авечкі цэлыя. Узнікае пытанне: ці не гэта прычына маўчання афіцыйных колаў у Францыі, якія не адмаўляюць сенсацыйных заяў Гекінга. Калі Джаконда з Грас будзе блізнюком луўрскай, тады першую маглі б набыць амерыканцы. Вядома, гэта будзе магчыма толькі ў тым выпадку, калі абедзве карціны аказжуцца сапраўды арыгіналамі, што пры сучасных сродках аналізу можна ўстанавіць амаль беспамылкова. І тады перамогуць тыя, хто заняў у спрэчцы пазіцыю залатой сярэдзіны: майстэрня Леанарда да Вінчы «выпусціла» не адну Монну Лізу, а некалькі. Пакуль што мы маем дзве, але гэта зусім не значыць, што іх не існуе больш.

Справа напэўна будзе мець працяг. А пакуль адкрылася перспектыва: усе, хто любіць корпацца на гарышчах, у старызне, — шукайце, шукайце Джаконду. Хто ведае, ці не заззяе пад пластам пылу або фарбамі другой карціны яшчэ адна ўсмешка Джаконды?

Часопіс «Польскі агляд».

ВЫДАТНЫ СЛАВІСТ

Навуковая грамадскасць Чэхаславакіі адзначае шасцідзесяцігоддзе з дня нараджэння выдатнага вучонага-славіста, члена-карэспандэнта Чэхаславацкай акадэміі навук прафесара Юліуса Даланскага. У гэты дзень славісты і ўсе прыхільнікі дружбы славянскіх народаў вітаюць у асобе Ю. Даланскага таленавітага вучонага, змагара за збліжэнне славянскіх народаў, нястомнага папулярызатара духоўных багацццяў славян.

Некалькі дзесяткаў год плённай творчай працы Ю. Даланскі аддаў вывучэнню славянскіх літаратур. Яго даследаванні ў галіне параўнальнага славянскага літаратуразнаўства вядомы далёка за межамі Чэхаславакіі. З'яўляючыся прызнаным знаўцам рускай, украінскай, беларускай, сербскай і іншых славянскіх літаратур, чэшскі вучоны яшчэ ў пачатку 30-х гадоў у радзе таленавітых прац паказвае традыцыйныя братнія сувязі славянскіх народаў, іх узаемнае духоўнае ўзбагачэнне, высока ацэньвае ролю перадавой рускай літаратуры ў духоўным жыцці славянскага свету. Яго працы: «Рускія асновы сербскага рэалізму» (1933 г.), «Масарык і Расія перадрэвалюцыйная» (1959 г.), «Майстры рускага рэалізму ў нас» (1960 г.) і іншыя вызначаюцца шырынёй і рознабаковасцю навуковых інтарэсаў, арганічнай сувяззю навуковага даследавання з прынцыпова важнымі праблемамі сучасных славянскіх культур. Створаныя на аснове багатага літаратурнага і гістарычнага матэрыялу і глыбока праблемныя па свайму характару кнігі, манаграфіі і артыкулы Ю. Даланскага атрымалі высокую ацэнку вучоных Савецкага Саюза, Польшчы, Балгарыі і іншых краін.

Раскрыццё шырокага і складанага ўзаемадзеяння славянскіх літаратур патрабуе ад даследчыка глыбокага разумення нацыянальнай своеасаблівасці той або іншай літаратуры, беражлівых адносін да яе скарбаў, патрабуе не толькі энцыклапедычных ведаў, але і вялікага навуковага таленту. Усё гэта ўдала спалучаецца ў асобе Ю. Даланскага — даследчыка, вучонага-патрыёта, інтэрнацыяналіста і гуманіста.

Яшчэ ў 20-я гады Ю. Даланскі з самай добразычлівай увагай сачыў за развіццём беларускай літаратуры. У 1927 годзе ў Празе ён сустракаўся з народным паэтам Беларусі Янкам Купалам. У друку з'яўляюцца яго працы аб Янку Купале, Якубе Коласе, Цішку Гартным. Яго выказванні аб беларускай літаратуры і беларускіх пісьменніках поўны пашаны і сяброўскай цеплыні. Вучоны на працягу многіх год настойліва папулярызуе беларускую літаратуру, выступае за пашырэнне культурных сувязей паміж чэшскім і беларускім народамі.

Як дырэктар Інстытута славяназнаўства Чэхаславацкай акадэміі навук Ю. Даланскі аддае многа сіл і энергіі стварэнню чэхаславацкага беларусазнаўства, падрыхтоўцы яго кадраў. Па яго ініцыятыве было адкрыта Беларускае аддаяленне ў Карлавым універсітэце. З падрыхтоўкай кадраў беларусазнаўцаў яму сваё чатырохраздкоўе «Выдатнаму вучонаму»:

«Дванаццацігадовы юнак прыехаў да нас цераз мора, і яго пісанні ўзрушылі ўсю кітайскую зямлю».

Пасля вяртання ў Сіла Цой Чы Вон публікуе 28 зборнікаў вершаў, напісаных ім у Кітаі. Такім чынам ён займае пэўнае месца ў літаратурным свеце таго часу.

Яго творчасць з самага пачатку характарызавалася пранікненнем у сутнасць грамадскіх з'яў і чалавечага жыцця, глыбокай цікавасцю і спачуваннем да абязdonелага народа, крытычным стаўленнем да пануючага класа. Верш «Цзяннаньскія дзяўчаты» паказвае падыход паэта да сацыяльных супярэчнасцей.

Распушчаны норавы ў гарадах Цзянняня,
выпешчаныя дзяўчаты строяць вочкі,
саромяцца яны вышываць, рукадзельнічаць,
нафарбаваўшыся, толькі перабіраюць струны,
навучыліся толькі ўсялякім мелодыям,
любоўным ветрам падвержаныя,
самі расхвальваюць сваю прыгажосць,
думаюць, быццам у іх вечная маладосць,
і насміхаюцца з бедных дзяўчат,
што з раніцы да ночы сядзяць за станком,
ткуць у цяжкай працы тканіны,
ад якіх ім не дастаецца ні кавалачка...

ЦОЙ ЧЫ ВОН — ПІСЬМЕННІК ІХ СТАГОДДЗЯ

КІМ ЮН СІК

У 857 годзе, больш за тысячу гадоў назад, калі буйнейшыя тры дзяржавы ў Карэі таго часу былі аб'яднаны каралеўствам Сіла, у сталіцы Кендзю нарадзіўся выдатны паэт і празаік свайго стагоддзя Цой Чы Вон, які пакінуў вялізарную літаратурную спадчыну. Тое, што захавалася да нашых часоў, дазваляе нам блізка разгледзець вобраз старажытнага паэта, як чалавека, і характэрныя рысы яго творчасці.

12-гадовым падлеткам Цоя Чы Вон едзе ў сталіцу Кітая Танскай дынастыі горад Чанань, дзе ён становіцца вядомым літаратарам. Толькі за другую палавіну свайго 16-гадовага жыцця ў Кітаі ён напісаў больш дзесяці тысяч вершаў.

Калі ён вяртаўся на радзіму, яго сябра Гао Юнь перад разлукаю падараваў яму сваё чатырохраздкоўе «Выдатнаму вучонаму»:

«Дванаццацігадовы юнак прыехаў да нас цераз мора, і яго пісанні ўзрушылі ўсю кітайскую зямлю».

Пасля вяртання ў Сіла Цой Чы Вон публікуе 28 зборнікаў вершаў, напісаных ім у Кітаі. Такім чынам ён займае пэўнае месца ў літаратурным свеце таго часу.

Яго творчасць з самага пачатку характарызавалася пранікненнем у сутнасць грамадскіх з'яў і чалавечага жыцця, глыбокай цікавасцю і спачуваннем да абязdoленага народа, крытычным стаўленнем да пануючага класа. Верш «Цзяннаньскія дзяўчаты» паказвае падыход паэта да сацыяльных супярэчнасцей.

Распушчаны норавы ў гарадах Цзянняня,
выпешчаныя дзяўчаты строяць вочкі,
саромяцца яны вышываць, рукадзельнічаць,
нафарбаваўшыся, толькі перабіраюць струны,
навучыліся толькі ўсялякім мелодыям,
любоўным ветрам падвержаныя,
самі расхвальваюць сваю прыгажосць,
думаюць, быццам у іх вечная маладосць,
і насміхаюцца з бедных дзяўчат,
што з раніцы да ночы сядзяць за станком,
ткуць у цяжкай працы тканіны,
ад якіх ім не дастаецца ні кавалачка...

Росквіт літаратурнай творчасці Цой Чы Вона адносіцца да канца IX і пачатку X стагоддзяў. У той час у Сіла вельмі абвастраліся сацыяльна-класавыя супярэчнасці і ўзмацнялася барацьба народа супраць феадалаў. Пісьменнік у асноўным ішоў разам з народам, узнімаў голас у яго абарону, выкрываў і асуджаў феадальны кіруючы клас. У адрозненне ад афіцыйнай паэзіі дваранскага саслоўя творы Цой Чы Вона былі прасякнуты пачуццём любві да роднай прыроды і гарачым спачуваннем да знясіленага і прыгнечанага народа. Паэт пры гэтым выказваў сваё імкненне жыць сумленна.

Важнае значэнне ў разуменні адносін Цой Чы Вона да грамадскай дзейнасці канца перыяду Сіла мае яго верш «Сціплая дума».

Прыгожай жанчынай можа аказацца ліса,
студантам-кніжнікам можа зрабіцца і барсук,
хто ведае: ці не звяры, змяніўшы аблічча,
з'яўляюцца ў чалавечым вобразе?
Змяніць вонкавы выгляд не цяжка,
захаваць сэрца чыстым вельмі цяжка.
Каб адрозніваць праўду ад хлусні,
трэба паліраваць люстра сэрца

Прагрэсіўную народную тэндэнцыю выяўляў Цой Чы Вон і ў сваіх празаічных творах. У гэтых адносінах цікавая навела «Магіла дзвюх жанчын».

Фабула яе нескладаная. Герой у першай асобе расказвае, што ён напісаў у вершах пажаданне сустрэцца з гаспадынямі невядомай магілы і прымацаваў яго да каменнай брамы грабніцы. Ноччу да яго з'яўляецца служанка, якая прыносіць вершы ў адказ. Праз яе ж герой пасылае новыя вершы. Хутка абедзве гераіні з'яўляюцца перад ім. Тут адбываецца размова траіх у вершах. Са світаннем жанчыны знікаюць, пакінуўшы кожная па адным вершы. У іх з горыччу расказваецца, што нябожчыцы былі дочкамі мясцовага багача, які хацеў супраць іх волі выдаць замуж адну за гандляра соллю, а другую за гандляра чаем. Ад засмучэння сёстры захварэлі і памерлі ў адзін дзень, калі старэйшай было 18, а малодшай — 16.

Надобныя навелы, дзе зусім матэрыяльна дзейнічаюць духі і іншыя звышнатуральныя істоты, з'яўляюцца ўзорам той літаратуры, якая папярэднічала паяўленню ў Карэі сярэдневяковага рамана. Цой Чы Вона трэба лічыць адным з пачынальнікаў падобнай літаратуры. Пафас гэтага твора ў пратэсце супраць канфуцыянскай этыкі, якая прыгнятала свабоду асобы. Прагрэсіўнасць пісьменніка выразілася ў імкненні абараніць свабоднае праяўленне індывідуальнасці чалавека, і ў гэтым высокі гуманізм творчасці Цой Чы Вона, які жыў тысячу гадоў назад.

Такім чынам ён выступаў супраць феадальна-патрыярхальнага парадку, які панаваў у той час. У выніку гэтага ён не пазбег праследаванняў з боку феадальных бюракратаў. Нягледзячы на выдатныя здольнасці і вялікую эрудыцыю, хутка пасля вяртання яго высылаюць са сталіцы на перыферыю. Каля дзесяці гадоў ён служыць гораданачальнікам маленькіх гарадоў Тэсан (цяпер Тэін правінцыі Паўночны Чжэла) і Бусен (цяпер Сэсан правінцыі Паўднёвы Чунчэн) і нарэшце пакідае чыноўніцкую службу.

Цой Чы Вон да канца свайго жыцця стаяў спіною да арыстакратычнага грамадства Сіла, бязлітаснага да простага люду і да чалавечай асобы, і пражыў жыццё як высокамаральны чалавек. Дата яго смерці невядомая.

Творчасць Цой Чы Вона, у многім зразумелая савецкаму чалавеку, стагоддзямі замоўчвалася і толькі ў эпоху Працоўнай партыі стала здабыткам шырокіх народных мас. Карэйскі народ цяпер правільна ацэньвае гэтага паэта і пісьменніка IX—X стагоддзяў і ганарыцца літаратурнай спадчынай, якую пакінулі яму продкі спрадвеку.

Часопіс «Новая Карэя».

У СВЕЦЕ КУЛЬТУРЫ

Ф. ШАЛЯПІН НА СЦЭНЕ ПАРЫЖСКАЙ ОПЕРЫ

У Францыі любілі і любяць Ф. Шаляпіна. Нягледзячы на недасканаласць тэхнікі запісу на плёнку ў тыя часы, тут так многа пласцінак Шаляпіна, як ні ў адной іншай краіне. Французскія кампазітары Маснэ і Равель пісалі спецыяльна для Шаляпіна. Але для французаў Шаляпін застаўся царом Барысам з оперы Мусаргскага. На думку тэатралаў, гэтая роля ў асобе Шаляпіна страціла свайго лепшага выканаўцу. І цяпер яшчэ пішуць і расказваюць шмат цікавага пра пастаноўку «Барыса Гадунова» ў Парыжскай оперы ў 1922 годзе і пра аднаўленне яе ў 1924 годзе з Шаляпіным.

Сведка гэтай падзеі Марыс Фор, які быў кіраўніком хору ў Парыжскай оперы, расказваў нам, як гэта адбывалася.

— Дырыжору аркестра Сержу Кусявіцкаму,—успамінае Марыс Фор,— які паставіў «Барыса Гадунова» ў Парыжскай оперы ў 1922 годзе (тады галоўную ролю выконваў Марку), было даручана аднавіць гэтую пастаноўку ў 1924 годзе з удзелам Шаляпіна, а таксама паставіць оперу «Хаваншчына». Я сам удзельнічаў у падрыхтоўцы гэтых двух спектакляў у якасці кіраўніка хору разам з маім калегам Анры Дэфосам.

На апошніх рэпетыцыях паміж Шаляпіным і Кусявіцкім адбыўся канфлікт, і, паколькі ў іх абодвух былі моцныя і вельмі цяжкія характары, прыйсці да згоды ім не ўдалося. І Кусявіцкі адмовіўся дырыжыраваць гэтымі дзвюма операмі. Тады па просьбе дырэктара оперы Жака Руша Анры Дэфос пагадзіўся ўзяць гэта на сябе і дырыжыраваў з вялікім майстэрствам.

Прэм'ера «Барыса Гадунова» адбылася 3 чэрвеня 1924 года, а «Хаваншчыны» — 5 чэрвеня. Наступныя спектаклі адбыліся адпаведна і і 3 ліпеня. 8 ліпеня Шаляпін даў у оперы сольны канцэрт. Я памятаю, якім вялікім поспехам карысталіся ўсе гэтыя выступленні. Партнёрамі Шаляпіна былі Дзютрэ (Дзімітрый), Фабер (Шуйскі), Аберці (Пімен) і Грэст (Варлаам).

Па словах Марыса Фора, кароткага ўдзелу Шаляпіна ў Парыжскай оперы аказалася дастаткова, каб пакласці адбітак на яе. «Шаляпін зрабіў незабыўнае ўражанне на артыстаў майго пакалення, але пра яго вялікі талент столькі напісана, што нічога новага не дадасі», — заканчвае Марыс Фор.

НОВЫ ПЕРАКЛАД «ЯЎГЕНІЯ АНЕГІНА»

Раман у вершах «Яўгеній Анегін» А. Пушкіна добра знаёмы югаслаўскаму чытачу. Яшчэ ў 1860 годзе «Яўгеній Анегін» быў упершыню выдадзены на харвацкай мове. З таго часу гэты выдатны твор вялікага рускага паэта неаднаразова перакладаўся на мовы народаў Югаславіі, у тым ліку тройчы выдаваўся на харвацкай мове, двойчы — на сербскай, а таксама на македонскай і славенскай.

Летась з'явіўся новы пераклад «Яўгенія Анегіна» на славенскую мову. Ён зроблены Радо Бардонам, які працаваў над ім на працягу амаль 20 год. Югаслаўскі друк высока ацэньвае якасць новага перакладу.

Газета «Палітыка» адзначае, што Р. Бардон «даў нам сапраўды паэтычны пераклад неўміручага твора Пушкіна». Газета адзначае выдатнае афармленне кнігі, лічачы, што з гэтага пункту погляду гэта, «напэўна, лепшая кніга», выдадзеная ў Югаславіі ў 1962 г.

ТАМІЛЬСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

Прэзідэнт Індыі доктар С. Радхакрышнан прысутнічаў на ўрачыстасці выхаду ў свет ў горадзе Мадрасе дзевятага і апошняга тома тамільскай энцыклапедыі. Тамільская мова — адна са старажытнейшых моваў Паўднёвай Індыі. Тамілы ўнеслі вялікі ўклад у культурную спадчыну індыйскай нацыі. Іх продак Маран Садагопа пераклаў з санскрыту на тамілі славутыя веды — старажытнейшыя помнікі старажытнаіндыйскай літаратуры, зборнікі гімнаў, малітваў і заклінанняў.

С. Радхакрышнан павіншаваў складальнікаў энцыклапедыі з цудоўнай навуковай працай, падкрэсліўшы, што ў ёй знайшло адлюстраванне аблічча зменлівага свету, яго дасягненні ў галіне астранаўтыкі, матэматыкі, фізікі, астраноміі, хіміі і ў іншых галінах чалавечых ведаў.

Работа над складаннем энцыклапедыі была пачата ў 1947 годзе. Яна мае звыш 15 тысяч тэм. Энцыклапедыя выдадзена пад рэдакцыяй вядомага тамільскага пісьменніка Перысамі Тхаорана. Вялікая заслуга ў тым, што гэтая манументальная навуковая праца ўбачыла свет, належыць Тамільскай акадэміі навук.

Тамільскія вучоныя збіраюцца прыступіць да працы над дзіцячай энцыклапедыяй на мове тамілі.

«СМЕРЦІ НЯМА» — РАМАН Т. МОНАВА

У старажытных Радопах на будаўніцтве вадасховішча працуе будаўнічая брыгада. Зусім звычайная брыгада, як і многія на сацыялістычных будоўлях. Незвычайным здаецца яе брыгадзір: змрочны, суровы і няветлівы. Шчырасць, сардэчнасць, мужнасць, патрабавальнасць да сябе і іншых у ім не кідаюцца ў вочы. Сапраўднае аблічча гэтага чалавека раскрывае трагедыя, смерць, але ён застаецца жыць у сэрцах сваіх таварышаў. Для такіх людзей — смерці няма. «Смерці няма» — так і назваў сваю кнігу, прысвечаную смелым і мужным гідрабудаўнікам, балгарскі пісьменнік Тодар Монаў.

Хутка на экраны краіны выйдзе першы балгарскі шырокаэкранны фільм «Смерці няма» па сцэнарыі Тодара Монава. Рэжысёры фільма — Хрыста Піскаў і Ірына Акташава. Аператар — Тодар Стаянаў.

ДА 400-ГОДДЗЯ ШЭКСПІРА

Гарадок Стратфард-он-Эйван, дзе нарадзіўся Вільям Шэкспір, рыхтуецца ўрачыста адзначыць 400-ю гадавіну з дня нараджэння вялікага англійскага драматурга, якая спаўняецца ў 1964 годзе.

Леві Фокс — намеснік старшыні Савета па святкаванню 400-годдзя з дня нараджэння Шэкспіра, заявіў, што шэкспіраўскія святкаванні ў Стратфард-он-Эйване будуць працягвацца ў 1964 годзе з красавіка па снежань.

У горадзе будзе наладжаны ўрачысты баль, адкрыты шэкспіраўскі цэнтр, арганізавана выстаўка, прысвечаная жыццю і творчасці Шэкспіра. Як звычайна, у горадзе будзе гастраліраваць каралеўскі шэкспіраўскі тэатр, у рэпертуар якога будуць уключаны творы Шэкспіра.

ГЭТА ЎБАЧАЦЬ КІНАГЛЕДАЧЫ

Шырокую праграму намеціў кінапракат ГДР на першае паўгоддзе 1963 года. Гледачы пазнаёмяцца з новымі работамі студыі ДЭФА — «Голы сярод ваўкоў», «Чамадан з дынамітам», «Туман», «Сакрэтны архіў на Эльбе», «Нядзельны шафёр», «Закаханы і пакараны», «Зялёная пачвара». Лаўрэаты Нацыянальнай прэміі Торндайкі пакажуць свой дакументальны фільм «Рускі цуд».

У рамках кінатыдня на экранах пойдуць паўторна сем мастацкіх карцін студыі ДЭФА, якія ўвайшлі ў лік сусветнавядомых кінатвораў. Сярод іх — «Рада багоў», «Зоркі», «Цар і цесляр», «Забойца сярод нас». Дзяржаўны кінаархіў прадастаўляе для пракату карціну «Пані Месяц».

Нямецкія кінагледачы пазнаёмяцца таксама з дзесяццю савецкімі фільмамі, у тым ліку з карцінамі «Іванава дзяцінства», «Узнятая цаліна» (III серыя), «Дзікі сабака Дзінга», «49 дзён».

У кінатэатрах ГДР пойдуць таксама фільмы, створаныя кінаработнікамі Чэхаславакіі, Польшчы, Балгарыі, Румыніі, Венгрыі, Югаславіі, Італіі, Францыі, Англіі, ЗША і Заходняй Германіі.

ТАСС.

ПРЫКАЗКІ Ў МАЛЮНКАХ

Знаёмім вас з новымі творамі заслужанага дзеяча мастацтваў Жуля Перахіма. Шматбаковы талент Жуля Перахіма, яго своеасаблівае мастацкае бачанне праявіліся і ў ілюстрацыях да прымавак і прыказак, узятых з румынскага фальклору. Змяшчаем рад такіх ілюстрацый.

Часопіс «НАРОДНАЯ РУМЫНІЯ».

Пяць пальцаў на руцэ — і ўсе розныя.

У яго рот за плотам. (Умее трымаць язык за зубамі).

Прачнуўся з ноччу ў галаве. (Прачнуўся — яшчэ і на дзень не займалася).

Калі ёсць галава, навошта табе розум?

З мухай на шапцы. (З грахом на сумленні).

БЕЗ СЛОЎ...

Малюнкі В. КЫВЕЦА. (Часопіс «Народная Румынія»).

ПРЫВІДЫ ЗНІКАЮЦЬ

[Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.].

Мы ад'язджалі. Вазок стаяў ля дзвярэй маёнтка, небагатыя пажыткі прывязалі ззаду. Я вывеў з дома Яноўскую, захутаную ў лёгкую футрачку, сам сеў поруч. Мы кінулі апошні позірк на палац, у якім зведалі боль і пакуты і знайшлі, нечакана для сябе, каханне, за якое не шкода аддаць і жыццё.

— Што ты думаеш рабіць з гэтым? — спытаў я.

Яноўская знізала плячыма, як ад марозу.

—Старыя рэчы аддам музеям, астатнія няхай бяруць тыя мужыкі, што сталі на абарону сваіх хат і выратавалі мяне. Палац таксама аддамо пад бальніцу, школу і яшчэ штонебудзь.

І горка ўсміхнулася:

— Маярат! Столькі крыві, такі клубок подласці, падступных злачынстваў, інтрыг. І дзеля чаго? Жменька золата. Не, бог з ім, з маяратам, гары ён ясным агнём.

Я абняў яе за тонкія плечы.

— Я так і думаў. Так і трэба было рабіць. Не патрэбна гэта нам, калі мы адшукалі адзін аднаго.

Мы пакінулі ў палацы новую ахмістрыню, удаву з дзіцёнкам, якіх я падабраў тады на дарозе. Слугі таксама засталіся на сваіх месцах.

І мы вельмі лёгка ўздыхнулі, калі палац знік за павароткай алеі. З кашмарам было скончана.

Калі мы выехалі з парку на верасовую пустку, што ішла ля Волатавай прорвы, і брама зачынілася за намі ў апошні раз, і ўжо заскакалі вакол курганы і пусткі, я пабачыў чалавека, які стаяў ля дарогі.

Чалавек гэты пайшоў вялікімі крокамі нам насустрач, затрымаў за аброць каня, і мы пазналі Рыгора. Ён стаяў у сваім кажусе, зблытаныя валасы падалі з-пад магеркі на лоб, на добрыя дзіцячыя вочы.

Я скочыў з воза.

— Рыгор, дарагі, што не прыйшоў развітацца?

— Хацеў адных вас сустрэць. Цяжка мне пасля гэтай гісторыі. Вы малайцы, што едзеце, тут паўсюль вам усё будзе нагадваць старое.

Палез рукою ў кішэнь і, пачырванеўшы, дастаў гліняную ляльку.

— Гэта вам, Надзея Раманаўна... Можа, паставіце дзе, успамінаць будзеце.

Надзея ўзяла яго за скроні і пацалавала ў лоб. Пасля дастала з вушэй завушніцы і паклала іх у шырокую чорную далонь паляўнічага.

— Будучай жонцы тваёй.

Рыгор крэкнуў, пакруціў галавою.

— Бывайце вы, бывайце лепей хутчэй. А то адзін грэх з вамі, разрумзаешся, як баба... Дзеці вы. Жадаю вам найлепшага, самага добрага на зямлі.

Я расцалаваў Рыгора ад усяе душы:

— Рыгорка. Лепшы друг. Едзем з намі, перасядзіш той час, калі будуць шукаць Дубатоўка і іншых. А то яшчэ які-небудзь паскуднік заб'е цябе.

Вочы Рыгора пасуровелі, і жолвы зарухаліся на сківіцах:

— Го, няхай паспрабуе.

І рукі ягоныя сціснулі доўгую стрэльбу, аж жылы на іх надзьмуліся.

— Зброя ў руках. Вось яна, няхай возьмуць. Не паеду. Маё царства — лясы. І гэтае царства павінна быць шчаслівым.

— І я веру ў гэта, — проста сказаў я.

Калі мы ад'ехалі далёка, я з узлесся яшчэ раз пабачыў на кургане ягоны вялізны сілуэт. Рыгор стаяў на фоне чырвонага неба з доўгай, вышэй галавы, стрэльбаю ў руках, у кажусе поўсцю наверх, які абцягваў яго ладную постаць. Вецер развейваў яго доўгія валасы.

Цар лясных мясцін.

Мы праехалі лясы праз дзень, таксама на світанні. Тут толькі я зразумеў, якая была розніца паміж яноўскім наваколлем і гэтай зямлёй. Мокрая высокая трава, сонца, радасць.

І над чыстымі хаткамі бусліныя вялізныя гнёзды і блакітная цішыня.

Гэта была новая, зусім іншая Беларусь. Там-сям стаялі на рэчках суконнавальні — зусім іншая эпоха, зусім іншыя звычаі.

Як жа павінна была глядзець на гэта мая жанчына з васемнаццатага стагоддзя, калі нават я за гэтыя тыдні забыў усё гэта.

Я глянуў на тую, што мелася стаць маёй жонкай. Вочы яе былі шырока і шчасліва раскрытыя, яна прыціскалася да мяне і часам перарывіста ўздыхала, як дзіця пасля слёз.

Мне вельмі хацелася, каб ёй было яшчэ лепш. І я часам нахіляўся і цалаваў яе тонкую руку.

Непакоіла мяне ў той час, ды і пазней, толькі яе хвароба. Таму я наняў на ўскраіне горада маленькую хатку з садам. Урачы сказалі, што гэта пройдзе ад спакойнага жыцця. І сапраўды, гэта прайшло, калі яна пражыла са мною два месяцы і сказала, што ў нас будзе дзіця.

Мы акружылі адзін аднаго такім морам пяшчоты і ўвагі, такой любоўю, што я нават праз дваццаць год здзіўляўся гэтаму, як сну. Нам было добра паўсюль, нават у Сібіры, куды я трапіў у 1902 годзе. Яна была больш, ніж проста жонкай, яна была другам да смерці.

Мы жылі доўга і шчасліва, як у песні:

Пакуль сонца ззяла над грэшнай зямлёй.

Але яшчэ і зараз я часам бачу ў сне сівыя верасовыя пусткі, чэзлую траву на паверхні прорваў і дзікае палаванне караля Стаха, якое скача па дрыгве. Не бразгаюць цуглі, моўчкі сядзець у сёдлах прамыя постаці коннікаў. Вецер развейвае іх валасы, плашчы, грывы коней, і самотная гостая зорка гарыць над іхнімі галовамі.

У жахлівым маўчанні шалёна скача над зямлёй дзікае палаванне караля Стаха.

Я прачынаюся і думаю, што не прайшоў ягоны час, пакуль ёсць цемра, голад, нераўнапраўе і цёмны жах на зямлі. Яно — сімвал усяго гэтага.

Хаваючыся напалову ў тумане, імчыць над змрочнай зямлёй дзікае палаванне.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Б. ЛАДЫГІНА, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. М. МАКАЛЬ, І. А. САНКОВА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19.
Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-25-25, аддзела літаратуры — 3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-24-61, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856 Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 09775